Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мск. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 138 (2042)
ПАНЯДЗЕЛАК, 25 мая
1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

Сілы партарганізацыі—на адказьнейшы вучастак сяўбы

БССР — адзін з асноўных ільнаводчых раёнаў Савецкага Саюзу. Таму пасеў тэхнічных культур — самы адказьнейшы і важнейшы вучастак змаганьня КП(б)Б за выкананьне праграмы другой бальшавіцкай вясны. «ЗАРАЗ, КАЛІ МЫ ЎЖО ВЫРАШЫЛІ Ў АСНОЎНЫМ ЗБОЖЖАВУЮ ПРАБЛЕМУ, МЫ МОЖАМ ПРЫСТУПІЦЬ ДА АДНАЧАСОВАГА ВЫРАШЭНЬНЯ І ПРАБЛЕМЫ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ І ПРАБЛЕМЫ ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР» (Сталін). Бягучы год павінен будзе ўжо даць рашаючыя перамогі ў змаганьні партыі за вырашэньне гэтай праблемы. Таму лічбы 240 ТЫС. гэкт. і 40 ТЫС. гэкт. пад пасеў ільну і канапель па БССР зьяўляюцца баявым апэрацыйным заданьнем усім партарганізацыям, заданьнем рэальным, магчымым ня толькі для поўнага выкананьня, а і ПЕРАВЫКАНАНЬНЯ.

Лічба ў 280 тыс. гэкт. пад пасеў тэхнічных культур павінна быць і будзе выканана. Патрэбна толькі БАЛЬШАВІЦКАЯ РАБОТА ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ па мабілізацыі рабочых саўгасаў, мас калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў — аднаасобнікаў на ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў, вызначаных пастановай ЦК КП(б)Б і СНК, патрэбна толькі баявое апэрацыйнае кіраўніцтва калгасамі і саўгасамі, якія адыгрываюць рашаючае значэньне ў вырашэньні праблем тэхнічных культур.

Зводка на 20 мая паказвае, што ПЛЯН СЯЎБЫ ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР ПА БССР ВЫКАНАН ТОЛЬКІ НА 6,4 ПРОЦ. Асноўныя 20 ільнаводчых раёнаў замест таго, каб згодна дырэктывы партыі і ўраду ў першы тэрмін сяўбы, г. зн. да 25 мая, напалову выканаць плян сяўбы ільну і канапель, выканалі яго толькі на 4 проц., а астатнія 14 ільнаводчых раёнаў яшчэ зусім ня прыступалі да сяўбы. Ганебныя паказальнікі! Яны ў поўнай меры выкрываюць апартуністычную стаўку на самацёк з боку раду раённых партыйных, савецкіх і каапэрацыйна-гаспадарчых органаў паказваюць іх нежаданьне скарыстаць наяўныя сродкі і рэсурсы, няўменьне мабілізаваць актыўнасьць і творчую ініцыятыву мас і накіраваць яе на выкананьне вызначаных плянаў.

І на самай справе. Чаго варты такія факты? Зьдзельшчына ў калгасах, якая вырашае пытаньне аб рабочай сіле, стымулюе прадукцыйнасьць працы, павышае яе якасьць, недапушчальна марудна ўводзіцца ў калгасах ільнаводчых раёнаў. З 3.040 калгасаў, якія ёсьць у ільнаводных раёнах, толькі 1.320 пераведзены на зьдзельшчыну.

Апартуністы ганебнае выкананьне плянаў сяўбы тэхнічных культур імкнуцца вытлумачыць «аб'ектыўнымі прычынамі», спасыланьнямі на наяўнасьць «вузкіх месц» у цягавай сіле, машынах і насеньні. Чаго варты гэтыя цьвярджэньні, мы можам убачыць на прыкладзе тых перадавых калгасаў, якія раней тэрміну скончылі веснавую сяўбу, якія выканалі і перавыканалі пляны як па збожжавых культурах, так і па ільне і каноплях. Справа ў тым, што НАЯЎНАСЬЦЬ ТРАКТАРОЎ, НАЯЎНАСЬЦЬ ЦЯГАВАЙ СІЛЫ МАКСЫМАЛЬНА НЕ СКАРЫСТОЎВАЮЦЦА ДЛЯ ВЫКАНАНЬНЯ ПАСТАЎЛЕНЫХ НА ЗАДАЧ. У гэтым мы можам упэўніцца на прыкладах ДРЫСЕНСКАГА раёну, дзе на складах райкаапільнасаюзу да гэтага часу ляжыць бяз руху да 200 тон ільнанасеньня.

Або такія магутныя вагары ў барацьбе за высокія тэмпы, як САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА. Хіба-ж яны ў поўнай меры скарыстаны партарганізацыямі ў саўгасах і калгасах і падначалены задачам выкананьня і перавыкананьня плянаў сяўбы тэхнічных культур? Нарэшце, хіба ўсе тыя вялікія льготы пасеўшчыкам ільну і канапель, што зьяўляюцца вялікім стымулам пашырэньня плошчы пад тэхнічнымі культурамі, даведзены партыйнымі арганізацыямі да найшырэйшых мас калгасьнікаў, беднаты і сераднякоў — аднаасобнікаў? Рад фактаў з раёнаў з усёй выразнасьцю паказваюць, што ПАРТЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ЎСІХ ГЭТЫХ СРОДКАЎ У МЭТАХ ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНАЎ КАНТРАКТАЦЫІ І СЯЎБЫ ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР НЕ СКАРЫСТАЛІ. Не скарысталі таму, што некаторыя і нізавыя партыйныя арганізацыя і кіруючыя раённыя парторганы апынуліся ў палоне самацёчных настрояў, ня ўвязвалі сваёй работы па папулярызацыі гэтых мерапрыемстваў з агульным змаганьнем за выкананьне праграмы другой бальшавіцкай вясны.

І агідней за ўсё тое, што часамі змаганьне за тэхнічныя культуры нізавымі партзьвеньнямі арганічна ня зьвязваецца з узмацненьнем наступленьня на кулацкія элемэнты. У радзе сельсаветаў не даны цьвёрдыя заданьні кулацка-заможным гаспадаркам па сяўбе ільну і канапель, а ў многіх выпадках там, дзе і даны, няма цьвёрдага кантролю над іх выкананьнем. Між тым, кулацтва сабатуе выкананьне заданьняў, імкнецца сарваць важнейшае мерапрыемства партыі і ўраду. ТАКІМ ФАКТАМ ЯЎНА АПАРТУНІСТЫЧНАГА ПАТУРАНЬНЯ КУЛАЦТВУ ТРЭБА ДАВАЦЬ САМЫ РАШУЧЫ АДПОР. Побач з гэтым, як гэта выявілася за апошнія дні, мы маем праявы махрова апартуністычнай практыкі ў пытаньнях барацьбы за тэхнічныя культуры ў радзе раённых. КУЛАЦКІЯ АГЕНТЫ, ПРАВЫЯ АПАРТУНІСТЫ, СТАЛІ НА ШЛЯХ МЭХАНІЧНА-ШТУЧНАГА ЗРЭЗВАНЬНЯ ПЛЯНАЎ СЯЎБЫ ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР. Так, ва ЎВАРАВІЦКІМ раёне плошча сяўбы ільну і канапель СКАРОЧАНА на 600 гэкт., КАМАРЫНСКІМ—на 400, ХОЙНІЦКІМ—на 200. Апартуністам-ж з КАСЬЦЮКОВІЦКАГА раёну дайшло да таго, што плян сяўбы тэхнічных культур скарацілі на 3.500 гэкт. Факты скарачэньня мы маем і па Лагойскім раёне, па Рагачоўскім і некаторых іншых.

Нас зьдзіўляе, як мясцовыя парторгі ня прайшлі міма гэтых ганебных фактаў? Як яны дазволілі так расьперазацца кулацкім агентам? Нічым іншым, як паніжэньнем бальшавіцкай пільнасьці, гэтага вытлумачыць нельга. Рад пасобных кіраўнікоў, у сувязі з гіганцкімі посьпехамі ў разгортваньні калектывізацыі, вырашылі зрабіць перадышку, панізілі тэмпы бальшавіцкай работы па арганізацыі пераможнага сацыялістычнага наступленьня.

Партыйныя органы ў асобе раённых камітэтаў КП(б)Б і кантрольных камісій павінны неадкладна ўжыць самыя строгія меры да апартуністаў, скараціўшых пляны, павінны неадкладна арыентаваць партыйныя арганізацыі на выкананьне і перавыкананьне пляну сяўбы тэхнічных культур. Раённыя камітэты партыі павінны неадкладна правесьці ход сяўбы ільну і канапель у калгасах, саўгасах і па аднаасобным сэктары, павінны даць самую строгую дырэктыву партыйным ячэйкам з указаньнем, што якасьць іх змаганьня за сяўбу будзе вымярацца ў залежнасьці ад таго, як яны побач з выкананьнем агульнага пляну даб'юцца засеву тэхнічнымі культурамі вызначанай плошчы.

Ячэйкі калгасаў і саўгасаў, асабліва ільнаводчых раёнаў, на ўсіх масавых сходах рабочых саўгасаў і МТС, на сходах калгасьнікаў і аднаасобнікаў павінны АБМЕРКАВАЦЬ ПАСТАНОВУ ЦК КП(б)Б І СНК АБ ПАШЫРЭНЬНІ ПАСЕВУ ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ. У сваёй штодзённай рабоце партыйныя ячэйкі павінны падначаліць задачам змаганьня за тэхнічныя культуры ўсе мэтады і формы сваёй работы. Зьдзельшчына, сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, усе наяўныя сродкі (машыны, насеньне і г. д.) павінны служыць пасьпяховаму змаганьню за 240 тыс. гэкт. ільну і 40 тыс. гэкт. канапель.

Тэмпы сяўбы — вырашаюць усё! Таму ў сваёй рабоце партыйныя ячэйкі, узмацняючы апэрацыйнае кіраўніцтва ходам палявых работ, павінны поўнасьцю ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ТЭРМІНЫ СЯЎБЫ ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР, ЯКІЯ ВЫЗНАЧАНЫ ПАРТЫЯЙ І ЎРАДАМ.

Вясковыя партарганізацыі пры актыўным удзеле шырокіх мас калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства, пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б правялі гіганцкую работу па выкананьні дырэктывы студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б або 30 проц. калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР да моманту масавай сяўбы. Раённыя партарганізацыі з такой-жа бальшавіцкай настойлівасьцю, помачы супрацьўленьне кулацтва, зьмятаючы са свайго шляху апартуністаў, даб'юцца поўнага выкананьня праграмы сяўбы тэхнічных культур у бягучую пасеўную кампанію!

Супроць падбродзкай правакацыі,

СУПРОЦЬ КРЫВАВАЙ ОРГІІ ФАШЫСЦКІХ АКУПАНТАЎ

У ЗАХ. БЕЛАРУСІ І ЗАХ. УКРАІНЕ

БУРА ПРАТЭСТАЎ ПРАЦОЎНЫХ БССР

Далоў фашысцкіх катаў!

Агульны сход рабочых менскай абуткавай фабрыкі, заслухаўшы інфармацыю аб наглай правакацыі фашысцкіх акупантаў у Зах. Беларусі канстатуе.

Замах у Падбродзьдзі, які быў арганізаваны фашысцкай ахранкай, зьяўляецца падрыхтоўчым крокам да затапленьня ў крыві нацыянальна-вызваленчага руху, да яшчэ больш зьверскай, чым у горшыя часы «пацыфікацыі» Зах. Украіны, расправы над беларускімі працоўнымі масамі.

Шалёнымі тэмпамі рыхтуючыся да ўзброенай інтэрвэнцыі супроць СССР, польскі фашызм імкнецца фізычна зьні шчыць авангард рабочае клясы і працоўнага сялянства—камуністычную партыю, якая бязьлітасна крыжуе злачынныя пляны польскай ваеншчыны. Але, ні зьверскімі расправамі, ні масавымі забойствамі і катаваньнямі палітзьняволеных ня спыніць рэвалюцыйнай барацьбы рабочай клясы і працоўнага сялянства, якая жорстка б'е па панаваньні фашысцкай дыктатуры.

У адказ на тэрор і правакацыю фашысцкіх акупантаў, агульны сход рабочых абяцае прыкласьці ўсе сілы на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляна трэцяга рашаючага году пяцігодкі, на узмацненьне абараназдольнасьці пралетарскай краіны.

Далоў фашысцкіх акупантаў!

Няхай жыве КПП—кіраўнік рэвалюцыйнай барацьбы!

Няхай жыве сусьветны Кастрычнік!

З абурэньнем пратэстуем супроць падбродзкай правакацыі

Рабочыя гомельскай шчаціннай фабрыкі з абурэньнем пратэстуюць супроць падбродзкай правакацыі, якую арганізавалі фашысцкія ўлады ў мэтах задушэньня рэвалюцыйнага руху працоўных мас Заходняй Беларусі і падрыхтоўкі ўзброенага нападу на бацькаўшчыну сусьветнага пралетарыяту—СССР.

У адказ на тэрор фашысцкіх катаў, сход абяцае з яшчэ большай энэргіяй змагацца за сацыялістычнае будаўніцтва, за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады. Рабочыя пастанаўляюць шырэй разгарнуць работу па вывучэньні ваеннай справы, ваеннай тэхнікі з тым, каб у патрэбны момант стаць падрыхтаванымі на абарону сваёй сацыялістычнай бацькаўшчыны.

***

Студэнцтва Гомельскага пэдінстытуту, рашуча пратэстуе супроць крывавага тэрору фашысцкіх акупантаў, супроць падбродзкіх правакацый, якія арганізоўвае фашысцкая дэфэнзыва ў мэтах падрыхтоўкі новай «пацыфікацыі», новых крывавых расправаў над працоўнымі масамі Заходняй Беларусі.

Няхай жыве КПЗБ—кіраўнік рэвалюцыйнай барацьбы!

Крывавым тэрорам фашызму ня спыніць рэвалюцыйна-вызваленчага руху працоўных Зах. Беларусі

Агульны сход рабочых, калгасьнікаў, беднякоў, сераднякоў і членаў саюзу мястэчка Лоева ганьбяць агідных фашысцкіх катаў, якія сыстэмай зьверскага тэрору і падбродзкіх правакацый імкнуцца задушыць нацыянальна-вызваленчы рух працоўных мас Зах. Беларусі.

Агульны сход у адказ на тэрор фашысцкіх акупантаў пастанаўляе з яшчэ большай энэргіяй змагацца за сацыялістычную перабудову вёскі шляхам суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як клясы. Для ўзмацненьня тэмпу сацыялістычнага будаўніцтва нашай краіны—сход падпісваецца на 100 проц. месячнага заработку на пазыку трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

***

Калгасьнікі і саўгасьнікі Бабруйскага раёну з абурэньнем пратэстуюць супроць нябачанага разгулу тэрору фашысцкіх акупантаў, шляхам якога яны імкнуцца задушыць рэвалюцыйную барацьбу рабочае клясы і працоўнага сялянства супроць панаваньня фашысцкай дыктатуры.

Сход пастанаўляе з яшчэ большай энэргіяй змагацца за саўгаснае і калгаснае будаўніцтва, за ўзмацненьне абараназдольнасьці краіны Саветаў.

Разбураны польскімі акупантамі каапэратыў на Зах Украіне

Масавае пазбаўленьне сялянства зямлі дыктатурай фашызму

Орган Лодзінскіх фашыстаў «Правда», характарызуючы сучаснае становішча зямляробства, якое цалкам апанавана жорсткім аграрным крызісам, прыходзіць да вельмі сумных і безнадзейных вывадаў. «Над Эўрапейскім зямляробствам—піша гэты орган» павісла адзань поўнага вынішчэньня. Працэсу гэтага ня адолее спрымаць ніякі Шыле, бо ў сучасным гаспадарчым і грамадзкім ладзе спосабу на гэта няма».

Перажоўваючы зьбітую хлусьню аб «савецкім дэмпінгу» «Правда» піша далей: «адна Расія шпарка з'арыентавалася ў створаным становішчы і вырашыла гэту праблему быстрым і радыкальным спосабам. На месцы аграмаджанай паменчыцкай уласнасьці створаны абшары ворнай зямлі, якія налічваюць мільёны гэктараў. Пры дапамозе самых удасканаленых машын, завезеных з Амэрыкі, а часткова выробленых унутры краіны дасягаюцца на гэтых абшарах проста непраўдападобныя пляны рэзультаты, як пад поглядам ураджайнасьці зборaў, так і пад поглядам кошту прадукцыі».

Які-ж шлях ратунку для капіталістычнага зямляробства бачыць гэты фашысцкі орган? «Належала-б адваяваць памешчыцкую ўласнасьць і тым або другім спосабам адабрацъ ад селяніна зямлю...»

Фашысцкі ўрад рашуча выконвае гэтыя патрабаваньні абшарніцтва. Шляхам ліквідацыі сэрвітутаў (сэрвітуты з памешчыкам карыстаньне лесам, пашаю і г. д.), прымусовай хутарызацыі, насаджаньня за кошт сялянскіх зямель асадніцтва, сяляне масава пазбаўляюцца зямлі.

Але рэвалюцыйныя выступленьні, якія ўсё часьцей і часьцей выбухаюць у вёсцы, сьведчаць аб тым, што сялянства, пад кіраўніцтвам кампартыі, вырашыць зямельнае пытаньне шляхам аграрнай рэвалюцыі.

Пабудуем узвод танкаў імя Ф. Дзяржынскага

Да ўсіх рабочых-палякаў, калгасьнікаў і польскіх працоўных

Пераможны ход сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне ўзбуджае базавы энтузіязм міжнароднага пралетарыяту і выклікае трывогу ў колах буржуазіі ўсіх краін.

Усё часьцей чуюцца простыя заклікі да ўзброенай інтэрвэнцыі супроць СССР.

На чале ўсіх антысавецкіх кампаній стаіць Францыя, самая мілітарысцкая з усіх мілітарысцкіх краін сьвету.

Галоўным саюзьнікам Францыі ў падрыхтоўцы інтэрвэнцыі зьяўляецца фашысцкая Польшча. Іменна яна павінна адыграць галоўную ролю ўзброенага авангарду ў надыходзячай вайне супроць СССР.

Польскі фашызм з нянавісьцю глядзіць на ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі сярод польскіх працоўных мас у СССР.

Рабочыя-палякі і польскія працоўныя Савецкага Саюзу многа раз даказвалі гатоўнасьць стаць на першым заклічу ў першыя рады Чырвонай арміі для абароны сваёй сацыялістычнай бацькаўшчыны.

На правакацыйную спробу ўзарваць савецкае пасольства ў Варшаве польскія працоўныя адказалі далейшым умацаваньнем абараназдольнасьці краіны і стыхійна распачалі збор грашовых сродкаў на пабудову ўзводу танкаў імя Ф. Дзяржынскага.

Асаблівым праяўленьнем рэвалюцыйнай хвалі польскіх працоўных мас СССР зьяўляецца засеў гэктараў абароны.

У адпаведнасьці з аднадушна ўхваленымі рэвалюцыямі рабочых і калгасьнікаў — палякаў узвод танкаў імя Ф. Дзяржынскага павінен быць пабудаваны і зданы да 14 гадавіны Кастрычніка — вернаму абаронцы пралетарскай рэвалюцыі — нашай слаўнай Чырвонай арміі.

Мы заклікаем усіх рабочых-палякаў, калгасьнікаў, польскія працоўныя масы ўсяго Саюзу да ўзмацненьня танкавай кампаніі і збору грашовых сродкаў на пабудову ўзводу танкаў.

Узмацненьне абараназдольнасьці нашай краіны забясьпечыць далейшыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва і ўмацуе Савецкі Саюз — цьвярдыню сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Кожны рабочы, кожны калгасьнік, кожны працоўны паляк павінен прыняць актыўны ўдзел у зборы сродкаў на танкі.

Проч імпэрыялістаў і іх дапаможнікаў з II інтэрнацыяналу, якія рыхтуюць інтэрвэнцыю супроць СССР.

Няхай жыве Чырвоная армія — апора мірнай палітыкі савецкай улады і верны вартавы савецкіх граніц!

ПРЭЗЫДЫУМ УСЕСАЮЗНАЙ ПОЛЬСКАЙ ТАНКАВАЙ КАМІСІІ.

„Рабочыя павінны ўзбройвацца і ствараць саветы рабочых дэпутатаў“

Адозва кампартыі Гішпаніі

ПАРЫЖ, 20. Орган гішпанскай кампартыі «Мундо Обрэро» публікуе адозву партыі камсамолу да рабочых і салдатаў Гішпаніі. У сувязі з апошнімі падзеямі адозва канстатуе што часовы гішпанскі ўрад зноў выкрыў свой глыбока рэакцыйны характар.

Адозва падкрэсьлівае, што кампартыя Гішпаніі і камсамол жорстка выкрылі рэакцыйны і антырабочы характар часовага ўраду, гэтай палітычнай зброі ўсёй гішпанскай буржуазіі, створанага выключна з тым, каб задушыць усякі сапраўды пралетарскі рух і каб забясьпечыць панаваньне буржуазіі. Барбарскае зьбойства мірных рабочых 10 мая ў Мадрыдзе пацьвердзіла поўнасьцю правільнасьць гэтых ацэнак.

Адозва заклікае ня верыць нікому і нічому, акрамя сваіх уласных сіл. «Рабочыя павінны ўзбройвацца і разброіць грамадзянскую гвардыю і ўсе рэакцыйныя сілы. Рабочыя павінны абараняцца шляхам стварэньня сапраўды рэвалюцыйных арганізацый, шляхам стварэньня рабочых камітэтаў на ўсіх заводах і фабрыках, у кожным майстэрні, у кожнай установе. Рабочыя павінны выбіраць сваіх дэлегатаў і ствараць саветы рабочых дэпутатаў».

Зварачаючыся да салдат і падкрэсьліваючы, што буржуазная рэспубліка надвяргае іх таму-ж жорсткаму рэжыму, што і манархія, у адозве гаворыцца: «на вас, салдат, усклядаецца тыя-ж абавязкі, але вам не дасцца ніякіх правоў. Стварайце салдацкія камітэты ў казармах. Ганіце вон афіцэраў-манархістаў і рэакцыянэраў і выбірайце самі сваіх начальнікаў».

Далей адозва заклікае салдат да аб'яднаньня з рабочымі, братацца з імі ў сумеснай барацьбе супроць спроб манархічных рэстаўрацый і ў абароне іх агульных патрабаваньняў і выбіраць дэлегатаў у саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў. (ТАСС).

Сьвінцовыя залпы па рабочай дэманстрацыі ў Баўгарыі

ВЕНА, 19. Як паведамляюць з Сафіі, 17 мая фашысцкія арганізацыі Баўгарыі, пры непасрэдным удзеле ўраду і буржуазных «апазыцыйных» партый, арганізавалі мітынг, на якім высунулі патрабаваньне «рэвізіі мірных дагавораў».

Рабочая партыя Баўгарыі арганізавала контр-мітынг пад лёзунгамі: «Не рэвізія, а анулываньне мірных дагавораў», «прэч фашызм», «прэч імпэрыялізм», «прэч антысавецкую вайну», «няхай жыве рабоча-сялянская балканская фэдэрацыя».

Ня гледзячы на забарону паліцыі, рабочая партыя пасьля мітынгу правяла дэманстрацыю, у якой прымала ўдзел каля тысячы чал. Жандармэрыя і паліцыя адкрылі страляніну па дэманстрантах і паранілі аднаго студэнта і рабочага. У часе сутычкі дэманстранты зьбілі і разброілі страляючага паліцэйскага. Пасьля доўгай барацьбы паліцыі ўдалося расьсеяць дэманстрантаў і арыштаваць 15 рабочых. (ТАСС).

Нанкінскі міністар аб савецка-кітайскай канфэрэнцыі

ШАНХАЙ, 23 Паводле вестак агэнцтва Гомінь, міністар замежных спраў нанкінскага ўраду — Ван-Чжэн-Цін заявіў у гутарцы з прадстаўніком друку, што савецка-кітайская канфэрэнцыя праходзіць здавальняюча і, што нанкінскі ўрад жадае вырашыць пазьнейшыя праблемы кітайска - савецкіх адносін.

(ТАСС).

Неадкладна прыступіць да рэалізацыі адозвы УсеЦСПС

(З АДОЗВЫ МАСКОЎСКІХ УДАРНІКАЎ—ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНІКАЎ ПРАЦЫ І ОРДЭНУ ЛЕНІНА).

Абгаварыўшы адозву УсеЦСПС у сувязі з другой гадавінай сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, мы, чырвонасьцяжнікі працы і ордэну Леніна заводаў і фабрык Масквы, заяўляем:

адозва УсеЦСПС аб далейшых задачах разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва павінна стаць баявой праграмай дзеяньняў для кожнай прафарганізацыі ад варштату да першапачатковай прафсаюзнай групы на вытворчасьці. Няхай завод спаборнічае з заводам, капальня з капальняй, цэх з цэхам, брыгада з брыгадай. Мы абавязуемся ў сябе на заводах і фабрыках стаць ініцыятарамі шырокага разгортваньня спаборніцтва ўнутры ударных брыгад, стаць арганізатарамі спаборніцтва (слёсар з слёсарам, токар з токарам, каваль з кавалём і г. д.) і разам з УсеЦСПС распрацаваць і арганізаваць заводзкія, раённыя, абласныя і рэспубліканскія конкурсы спаборніцтва на лепшага рабочага ці іншай спэцыяльнасьці.

У сябе ў цэху, на заводзе, у першую чаргу ў сваёй брыгадзе, мы за стасуем вопыт гаспадарча-разрахункових брыгад.

Мы прапануем пры УсеЦСПС арганізаваць сталую нараду ўдарнікаў, якія ўзнагароджаны ордэнам Леніна і працоўным сьцягам маскоўскіх заводаў і прадпрыемстваў з тым, каб нашым вопытам і работай дапамагчы УсеЦСПС пры распрацоўцы буйнейшых вытворчых задач прафсаюзу.

Мы прапануем арганізаваць такія-ж нарады пры саўпрофах прамысловых раёнаў. Саўпрофы павінны арганізаваць тэхнічнае навучаньне чырвонасьцяжнікаў.

У адказ на заклік УсеЦСПС «над асаблівы нагляд узяць рашаючыя вучасткі народнай гаспадаркі»—мы прапануем арганізаваць Усесаюзную вытворчую дапамогу Данбасу. Бярэце шэфства над пазасобнымі капальнямі Данбасу. Арганізуйце сквазны кантроль над выкананьнем заказаў абставяньня, спэцвопраткі, жыльбудаўніцтва для рабочых Данбасу. Мільёны ўдарнікаў над кіраўніцтвам ленінскай партыі, перамагаючы шалёнае супраціўленьне клясавага ворага і яго агентуры—правых і «левых» апартуністаў, ідуць ад перамогі да перамогі. Мы заклікаем новыя тысячы пралетараў уступіць на ўдарныя брыгады.

Няхай жыве сацыялістычнае спаборніцтва! Няхай жыве УсеКП(б)—партыя, якая вядзе рабочую клясу ад перамогі да перамогі!

Выклік рабочых заводу імя Варашылава прыняты

Калгасцэнтр вылучыў 11 спэцыялістаў для ўдзелу ў падрыхтоўцы і правядзеньні усебеларускага зьезду рабселькораў

Пастанова праўленьня Калгасцэнтру БССР з удзелам спэцыялістаў ўсяго калектыву

Улічваючы вялізарную ролю пралетарскага друку ў барацьбе за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, у правядзеньні суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі на гэтай аснове кулацтва як клясы, а таксама вялізарную ролю друку ў правільнай арганізацыі высока-таварнай калектыўнай вытворчасьці, улічваючы ролю ў барацьбе за сацыялізм арміі рабселькораў, праўленьне Калгасцэнтру БССР і ўвесь калектыў работнікаў прымаюць выклік рабочых чырвонасьцяжнага заводу імя Кліма Варашылава.

Абавязуемся аказваць усямернае садзейнічаньне і практычную дапамогу ў падрыхтоўцы і правядзеньні Усебеларускага зьезду рабселькораў, для чаго ВЫЛУЧАЕМ НАСТУПНЫХ СПЭЦЫЯЛІСТАЎ прасобных галін сельскай гаспадаркі, па пытаньнях разьвіцьця:

а) буйной рагатай жывёлы —т. СЕРКУЛЬСКАГА,
б) сьвінагадоўлі — т. ПАЛЕСКАГА,
в) тэхкультур (пён, канопліі) — т. КАВАЛЁВА,
г) зернавых і прапашных культур — т. ЛАШКЕВІЧА,
д) гародніх культур — т. ГАЎРЫЛОВІЧА,
е) пытаньнях арганізацыі працы ў калгасах — т. БАЛЦІНА,
ж) па стварэньні кармавой базы—т. МАНКЕВІЧА,
з) па птушніцтве — т. АНТАНІКОЎСКАГА,
і) пытаньнях канягадоўлі — т. ЧАРНЯЎСКАГА,
к) мэханізацыі сельскай гаспадаркі — т. ДЗЕХЦЯРОВА,
л) насенаводзтве — т. ЗАГАРЭЛЬСКАГА.

ВЫКЛІКАЕМ БЕЛСЕЛЬТРЭСТ, СЬВІНАТРЭСТ, НАСЕННАТРЭСТ, БАК І НДІ ВЫЛУЧЫЦЬ ЛЕПШЫХ РАБОТНІКАЎ ДЛЯ ЎДЗЕЛУ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ І ПРАВЯДЗЕНЬНІ ЗЬЕЗДУ РАБСЕЛЬКОРАЎ.

ПРАЎЛЕНЬНЕ КАЛГАСЦЭНТРУ БССР.
КАЛЕКТЫЎ РАБОТНІКАЎ.

ЯК ВЫКОНВАЮЦЦА ПЛЯНЫ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ І НАСЕЛЬНІЦТВА АПАЛАМ

Па гэтым пытаньні рэдакцыя газэты „Зьвязда“

скліпкае

30 мая ў 7 гадзін вечара,

у памяшканьні рэдакцыі (Савецкая 63, 3-ці паверх)

ШЫРОКУЮ НАРАДУ прадстаўнікоў зацікаўленых установаў і арганізацый.

На нарадзе будуць заслуханы—даклад прадстаўніка Дзяржплану і суадклады прадстаўнікоў ВСНГБ і Леобелу.

Запрашаюцца прадстаўнікі Белторфу, Белкавпсаюзу, Наркамснабу, ЦКК НК-РСІ, гаспадарчых аб'яднаньняў, Белсамрамсаюзу, чыгуначнага транспарту, мясцовай прамысловасьці, прафсаюзаў, а таксама ўдарнікі, рабкоры і трыбунныя меншыя фабрык і заводаў, зацікаўленых гэтым пытаньнем.

Просім зьявіцца своечасова.

«ЗЬВЯЗДА».

Два сьветы—дзьве палітыкі

Закончылася сэсія «эўрапэйскай камісіі». Вынікі яе работы ня могуць ня прызнаць «архипалачэнцкімі» нават найбольш ярыя прыхільнікі брыянаўскай Пан-Эўропы. Створана каля паўтузіна камісій і падкамісій, якія павінны вывучаць, распрацоўваць, дапрацоўваць, пераапрацоўваць розныя пытаньні і прапановы; складзен даклад, які па сутнасьці, не адказвае ні на адно пытаньне, выбрана асобая падкамісія для ўзгадненьня прапаноў у розных падкамісіях.

Аднак, дзейнасьць жэнэўскай канфэрэнцыі адзначаецца зусім не ў рэзалюцыях гэтай канфэрэнцыі і ня ў выбары камісій і падкамісій. Сапраўдны сэнс работы эўрапэйскай камісіі і сэсіяў рады Лігі нацый у Жэнэве, а таксама пасяджэньняў так званай шпанічнай камісіі ў Лёндане заключаецца ў тым, што яны ў поўнай відавочнасьцю выявілі лішні раз процілегласьць двух сьветаў—сьвету капіталістычнага, які задыхаецца ў найглыбейшым эканамічным крызісе, і сьвету, дзе будуецца сацыялізм. Больш таго: яны выявілі поўную процілегласьць палітыкі СССР і палітыкі імпэрыялістычных дзяржаў, якая вынікае з прынцыпорага разьвіцьця дзьвюх грамадзкіх сыстэм.

Значэньне гэтых міжнародных канфэрэнцый заключаецца таксама ў тым, што прынцыповая процілегласьць паміж палітыкай СССР і палітыкай імпэрыялістычных дзяржаў выкрыта перад шырокімі масамі пралетараў і працоўных імпэрыялістычных краін.

У Жэнэве на сэсіі рады Лігі Нацый абмяркоўвалася пытаньне аб аўстра-нямецкім мытным саюзе. Не падлягае найменшаму сумненьню, што Нямеччына і Аўстрыя пацярпелі буйнае дыпляматычнае паражэньне. Пытаньне аб аўстра-нямецкім мытным саюзе перадана на разгляд гаагскага трыбуналу. Аўстрыі і Нямеччыне забаранецца весьці далей перагаворы аб заключэньні мытнага саюзу, а імпэрыялістычная Францыя захавала за сабой поўнае права ўзьняць пытаньне аб забароне аўстра-нямецкага мытнага саюзу, якая-бы ні была пастанова Гаагскага трыбуналу. Нямеччыне і Аўстрыі яшчэ раз напомнілі, што яны краіны пераможаныя, што канцуг Вэрсальскага і Сэн-Жэрмэнскага мірных дагавораў яшчэ даволі моцныя. Францускі капітал прынёў да краху буйнейшы аўстрыйскі банк, які фінансуе 80 проц. аўстрыйскай прамысловасьці для таго, каб кінуць слабую, пяжыцьцяздольную аўстрыйскую буржуазную дзяржаву ў руіны.

Плян аўстра-нямецкага мытнага саюзу быў праяўленьнем указаньняў і апэтытаў новага нямецкага імпэрыялізму. Нямецкія і аўстрыйскія камуністы ў барацьбе супроць сваіх урадаў буржуазнай дыктатуры павінны выкрыць імпэрыялістычную сутнасьць гэтага пляну. У той-жа час францускія камуністы абвяргаюць мабілізаваць працоўных Францыі супроць рабаўнічай палітыкі францускага імпэрыялізму, які пазбаўляе Аўстрыю і Нямеччыну іх суверэнных правоў, каб яшчэ больш рашуча выціскаць рэвалюцыйныя пляцяжы з працоўных Нямеччыны і Аўстрыі. Жэнэва абвастрыла супярэчнасьці паміж пераможцамі і пераможанымі.

Палітыка СССР падана ў прамове тав. Літвінава ясна. СССР не падпісаў рабуночных мірных дагавораў. Ён супроць пазбаўленьня якой-бы там ні было краіны яе суверэнных правоў. На пасяджэньнях эўрапэйскай камісіі і яе падкамісій ў сучасны момант хаваюць усе пляны «выратаваньня Эўропы» ад эканамічнага крызісу. Аўстра-нямецкі мытны саюз пахаваны па трэцім разградзе.

Італьянскі плян «рэгіянальных згод» адхілены. Цяпер, мяркуючы па апошніх паведамленьнях з Жэнэвы, хаваюць таксама і плян Брыяна.

Ангельскі імпэрыялізм не зацікаўлен у тым, каб пад кіраўніцтвам францускага капіталу стваралася якая-б там ні была эканамічная арганізацыя для вывазу сельска - гаспадарчых прадуктаў паўднёва-усходніх і ўсходніх краін Эўропы ў прамысловыя краіны: гэта ўдарыла-б ня толькі па ангельскіх заакіянскіх дамінёнах, якія вывозяць с.-г. прадукты, але таксама і па ўвозе гэтых прадуктаў у Англію, зацікаўленую ў нізкіх цэнах на іх. Італія выказваецца супроць істотнейшых пунктаў пляну Брыяна, бо італьянскі імпэрыялізм змагаецца ня толькі супроць францускага гегемоніі над капіталістычнай часткай эўрапэйскага кантынэнту, але і супроць гегемоніі францускага імпэрыялізму наогул. А францускі імпэрыялізм выступае супроць італьянскага пляну «рэгіянальных згод», бо ён зусім не зацікаўлен у тым, каб Італія ўцягвала ў сваю арбіту Аўстрыю і Вэнгрыю, а ўрэшце Грэцыю і Баўгарыю і выкарыстоўваючы ням

Барацьба за пасеў 240,000 га ільну і 40,000 канапель — базавая задача кожнай арганізацыі ячэйкі КП(б)Б

У Хойніцкім, Уваравіцкім, Камарынскім і Менскім раёнах апартуністы скарачаюць плошчы пасеву тэхнічных культур

У ТЭРМІН І ПОУНАСЬЦЮ

выканаць пляны пасеву тэхнічных культур

У Беларусі шырока разгорнута масавая сяўба. Аднак, тэмпы сяўбы далёка пездавальняючыя. Асабліва дрэнна праходзіць пасеў тэхнічных культур. На 20 мая **плян пасеву тэхнічных культур на БССР выкананы толькі на 6,4 проц.** Ільнаводчыя раёны, якія павінны засеяць 162.000 гектараў тэхнічных культур, не ўзялі бальшавіцкіх тэмпаў па пасеву. 1-га чэрвеня апошні тэрмін сяўбы. Між тым, першая дэкада масавай сяўбы выклікае трывогу. Паводле даных Наркамзему на 20 мая плян пасеву тэхнічных культур па 20-ці ільнаводчых раёнах выкананы толькі на 4 проц. А 14 ільнаводчых раёнаў да сяўбы тэхнічных культур яшчэ не прыступілі.

Капыльскі раён выканаў плян на 30 процантаў. Па іншых раёнах выкананьне пляну не перавышае 8 проц., а па іншых раёнах (Хоцімскі, Халопеніцкі, Сіроцінскі, Коханаўскі, Межанскі і Лядзянскі) выкананьне пляну не перавышае 1 проц.

У ліку паўднёвых раёнаў, якія павінны да 25 мая закончыць поўнасьцю сяўбу, ёсьць 3 ільнаводчыя. Гэтыя раёны ганебна адстаюць па засеве тэхнічных культур. **Чырвонапольскі ільнаводчы** раён на 20 мая выканаў плян пасеву тэхнічных культур толькі **на 8 проц., Любанскі — на 8,6 проц. А Кармянскі** раён да сяўбы тэхнічных культур яшчэ не прыступаў.

Калгасы ільнаводчых раёнаў павінны засеяць 60 тыс. гэкт. тэхнічных культур. Замест паказу ўзораў барацьбы за пасеў тэхнічных культур калгасны сэктар адстае. На 20 мая плян пасеву калгасамі выкананы толькі на 5 проц.

Адставаньне калгаснага сэктару тлумачыцца адсутнасьцю правільнай арганізацыі працы, няпоўным пераводам калгасаў на зьдзельшчыну, адсутнасьцю шырока разгорнутых сацыялістычных мэтадаў працы на палёх. Паводле даных Наркамзему, на 20 мая з 8.040 калгасаў ільнаводчых раёнаў, толькі 1.320 пераведзены на зьдзельшчыну. У **Халопеніцкім, Бешанковіцкім, Высачанскім, Крупскім і Сіроцінскім раёнах ні адзін калгас не пераведзен** поўнасьцю на зьдзельшчыну.

Адстае таксама і індывідуальны сэктар, які выканаў плян сяўбы толькі па 4 проц.

Асабліва катастрафічнае становішча з ходам сяўбы ў ільнаканапляводчых саўгасах. На 20 мая ні адзін з саўгасаў не пачаў сяўбы. Спасыланьні на аб'ектыўныя прычыны не заслугоўваюць увагі. У саўгасе **Бігосава** пры наяўнасьці трактараў, рабочай сілы — сяўбы не распачалі. Цягавая сіла не скарыстоўваецца. Да гэтага часу ідуць спрэчкі аб пляне пасеву тэхнічных культур.

«Зьвязда» ня раз паказвала на правапартуністычную практыку паасобных раёнаў, на іх імкненьні скарачаць пляны пасеву тэхнічных культур. Сыгналы «Зьвязды» не пачуты! Толькі ў апошнія дні выяўлена, што **па 6-ці раёнах плян пасеву тэхнічных культур скарочан раёнамі на 5.200 гэкт., Менскі раён скараціў плошчу тэхнічных культур на 500 гэкц., Уваравіцкі — 600, Хойніцкі — 200, Камарынскі — 400 і г. д.**

Таксама скарацілі плошчу пасеву ільнаканапляводчыя саўгасы. Паводле пляну Наркамзему, ільнаканапляводчыя саўгасы ў веснавую пасеўную кампанію павінны засяяць 2.000 гэкт. ільну і 3.000 гэкт. канапель. Ільнаканапляводтрэст, які знаходзіцца ў Маскве, ня ведаючы стану саўгасаў, скараціў плян пасеву: ільну на 600 гэкт. і канапель на 1.100 гэкт. Скарочаны плян даведзен да саўгасаў. На шматлікія катэгарычныя прапановы Наркамзему БССР прыняць плян пасеву тэхнічных культур поўнасьцю, Ільнаканапляводтрэст катэгарычна адмаўляецца. 6 мая на пасяджэньні Дзяржпляну БССР член праўленьня Канапляводтрэсту тав. **Багданаў** ужо згаджаўся на павышэньні пляну: да 1.500 гэкт. ільну і 2.400 гэкт. канапель. Ён паехаў у Маскву, а заданьня саўгасам усё-ж не зьмяніў. **СНК БССР, заслухаўшы паведамленьне Наркамзему аб скарачэньні плошчаў ільнаканапляводсаўгасамі, пацьвердзіў раней шыя кантрольныя лічбы пасеву тэхнічных культур.** Усё-ж на сёнешні дзень плян поўнасьцю не прыняты.

Нельга не адзначыць паводзін партыйных арганізацый ільнаканапляводсаўгасаў і раённых камітэтаў партыі, на тэрыторыі якіх знаходзяцца ільнаканапляводсаўгасы. Ведаючы аб скарачэньні пляну пасеву тэхнічных культур, партыйныя арганізацыі саўгасаў **не далі рашучага адпору** апартуністычнай практыцы, апартуністам з Ільнаканапляводтрэсту. Партыйныя арганізацыі не абмеркавалі пляну Наркамзему БССР, ня выявілі магчымасьцяй прыняцьця і выкананьня гэтага пляну, а найбольш па лініі найменшага супрэціўленьня, прынялі плян паданы ільнаканапляводтрэстам, які значна скарачае плошчу пасеву тэхнічных культур.

Набліжаецца канец сяўбы, а да выкананьня пляну далёка. Максымальна скарыстаць кожную гадзіну — задача дня! Неадкладна пакончыць з апартуністычнай практыкай, з імкненьнямі апартуністаў скараціць пляны: пасеву тэхнічных культур. Плян 240 тыс. гэкт. ільну і 40 тыс. гэкт. канапель павінен быць выкананы поўнасьцю і ў тэрмін.

Зламаць купацкі сабатаж, даць рашаючы бой апартуністам, усе сілы партыйных і камсамольскіх арганізацый мабілізаваць на выкананьне важнейшай дырэктывы партыі

Ільнаканапляводчыя саўгасы — без апэрацыйнага кіраўніцтва

Пастанова VI зьезду саветаў па дакладу тав. **Якаўлева** аб саўгасным будаўніцтве дала зусім выразную характарыстыку ролі саўгасаў у справе рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Зусім ясна, што пры вырашэньні праблемы тэхнічных культур па БССР набывае вялікае значэньне будаўніцтва саўгасаў, спэцыялізаваных па ільнаводзтве і канапляводзтве.

У бягучую пасеўную кампанію ў паход за ільном і канаплямі выступаюць 4 наступныя саўгасы: **Імя 10-годзьдзя БССР, «Загальле», «Боркавічы» і «Бігосава».** Для іх характарыстыкі падамо маленькую таблічку:

НАЗВА САЎГАСУ	Агульная плошча	Пасеўн. плошча на 1931 г.				%% тэхн. культур у пасеве
		Ільну	Канапель	Інш.	Усяго:	
Імя 10-годзьдзя БССР . . .	8.550	—	1.200	2.000	3.200	37,5
«Загалье»	41.000	—	700	800	1.500	46,7
«Боркавічы»	7.200	900	—	400	1.300	69,2
«Бігосава»	2.720	500	—	300	800	62,5
	59.470	1.400	1.900	3.500	6 800	47,1

Да гэтай характарыстыкі трэба дадаць: саўгасы «Загалье» і «Бігосава» распачынаюць працу толькі ў гэтым годзе; саўгасы імя 10 годзьдзя БССР і «Загалье» будуюцца на асушаных балотах і тэмпы будаўніцтва іх зьвязаны з ходам асушальных работ на гэтых балотах, асваеньне-ж плошчы ільнасаўгасаў «Боркавічы» і «Бігосава» патрабуе капітальных укладаньняў на раскарчоўку і частковую асушку.

Характарыстыка саўгасаў паказвае, што ўжо ў веснавую кампанію 1931 г. разгортваецца значная работа на скарыстаньні новых зямель пад тэхкультуры. У сувязі з гэтым вельмі важна паказаць і зьнішчыць тыя недахопы, якія выявіліся ў часе падыхтоўкі да вясны.

Кіруе саўгасамі ўсесаюзны Ільнаканапляводтрэст. Рад фактаў паказвае, што гэта кіраўніцтва вельмі кульгае. Прамфінпляны саўгасаў разглядаліся і зацьвярджаліся трэстам **у сярэдзіне лютага,** што ў значнай меры адбілася на своячасовай падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, асабліва ў новых саўгасах. Так, спэцыялізаваных па ільнаводзтве і канапляводзтве.

У бягучую пасеўную кампанію ў паход за ільном і канаплямі выступаюць 4 наступныя саўгасы: **Імя 10-годзьдзя БССР, «Загальле», «Боркавічы» і «Бігосава».** Для іх характарыстыкі падамо маленькую таблічку:

НАЗВА САЎГАСУ	Агульная плошча	Пасеўн. плошча на 1931 г.				%% тэхн. культур у пасеве
		Ільну	Канапель	Інш.	Усяго:	
Імя 10-годзьдзя БССР . . .	8.550	—	1.200	2.000	3.200	37,5
«Загалье»	41.000	—	700	800	1.500	46,7
«Боркавічы»	7.200	900	—	400	1.300	69,2
«Бігосава»	2.720	500	—	300	800	62,5
	59.470	1.400	1.900	3.500	6 800	47,1

Да гэтай характарыстыкі трэба дадаць: саўгасы «Загалье» і «Бігосава» распачынаюць працу толькі ў гэтым годзе; саўгасы імя 10 годзьдзя БССР і «Загалье» будуюцца на асушаных балотах і тэмпы будаўніцтва іх зьвязаны з ходам асушальных работ на гэтых балотах, асваеньне-ж плошчы ільнасаўгасаў «Боркавічы» і «Бігосава» патрабуе капітальных укладаньняў на раскарчоўку і частковую асушку.

Характарыстыка саўгасаў паказвае, што ўжо ў веснавую кампанію 1931 г. разгортваецца значная работа на скарыстаньні новых зямель пад тэхкультуры. У сувязі з гэтым вельмі важна паказаць і зьнішчыць тыя недахопы, якія выявіліся ў часе падыхтоўкі да вясны.

Кіруе саўгасамі ўсесаюзны Ільнаканапляводтрэст. Рад фактаў паказвае, што гэта кіраўніцтва вельмі кульгае. Прамфінпляны саўгасаў разглядаліся і зацьвярджаліся трэстам **у сярэдзіне лютага,** што ў значнай меры адбілася на своячасовай падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, асабліва ў новых саўгасах. Так, на саўгасах «Бігосава» і «Загалье» толькі ў канцы лютага разгортваецца камплектаваньне коннага транспарту, у выніку чаго значная частка пляну зімовых перавозак пасеўгрузаў і лесаматэрыялаў ня выканана. Пасеўныя грузы (насеньне, угнаеньне) паступалі несвоячасова. Па саўгасе «Загалье», які ня мае дробных надзяных шляхоў, зараз стварылася пагроза ў выкананьні пляну сяўбы з-за адсутнасьці перавозачных сродкаў для перакідваньня пасеўных грузаў.

Саўгасу імя 10-годзьдзя БССР не хапае 100 тон насеннага аўса, а для «Бігосава» — насеньня траў на 200 га.

Разьмеркаваньне штучных угнаеньняў было праведзена па-галаванску. Гораспэцы з трэсту парашылі, што на балотных глебах аусім непатрэбны ўгнаеньні і ў сваіх першапачатковых разнарадках не прадугледзелі для «Загальля» ні аднаго цэнтнэра ўгнаеньня. Толькі ўмяшаньне Наркамзему Беларусі праз НКЗ СССР выправіла гэту «памылку». З вялікім спазьненьнем паступаюць трактары і прычэпы інвэнтар. Да моманту выхаду ў поле «Бігосава» мела 25 проц. трактараў і прычэпнага інвэнтару. «Загалье» ня мае яшчэ асноўнага прычэпнага інвэнтару. Яшчэ горш з нафтатарай, якое няма ні ў «Бігосаве», ні ў «Загальлі». Трэст паведаміў толькі ў сакавіку, што цыстэрнаў ня будзе, і б'е аб гэтым трывогу, калі на месцы МТС ужо мабілізавалі ўсе магчымасьці. Пры невыстарчальным забесьпячэньні бочкамі гэтым саўгасам прыдзецца вазіць нафтапрадукты за 15-17 кілёмэтраў.

Трэба таксама адзначыць блытаніну і пасылку не па адрасе. Насеньне сіласных культур пасылаецца ў «Бігосава», які ня сее гэтых культур, прадукцыйнай жывёлы ня мае; трактарныя сцепкі для «Бігосава» паступаюць у «Загалье» (сцепкі без калёс і нягодны ў дасланым выглядзе). «Памылкова» пераводзіцца саўгасу «Бігосава» 10.000 руб., прызначаных для «Загальля»; трактарныя цялежкі запараджваюцца не для «Загальля», якому яны патрэбны, а саўгасу імя 10-годзьдзя БССР.

Упаўнаважаны трэсту па БССР замест таго, каб на-хаду выправіць гэтыя памылкі, толькі і робіць, што пішэ паперкі ў трэст. Ён чават ня мае пастаянных вестак аб становішчы працы ў саўгасах, атрымлівае гэтыя весткі са спазьненьнем. Як пераведзены саўгасы на зьдзельшчыну, як праходзіць даварная кампанія, што робіцца ў саўгасах у сучасны момант — аб гэтым упаўнаважаны трэсту ня ведае.

Задачы, пастаўленыя партыяй і ўрадам перад прамысловасьцю саўгасаў, сацыялістычнымі мэтадамі павінны быць выкананы.

Трэба ўжо сёньня сказаць, што кіраўніцтва ільнаканапляводчымі саўгасамі не забясьпечвае патрэбных тэмпаў працы. З належнай выразнасьцю паказана гэта падрыхтоўка да другой бальшавіцкай вясны. Гэта неабходна ўлічыць у далейшым, калі мы распачынаем пашыранае будаўніцтва ільнаяньковых саўгасаў у БССР. Неабходна арганізоўваць сапраўды апэрацыйнае кіраўніцтва ільнаканапляводчымі саўгасамі БССР, якое забясьпечвала-б пасьпяховае выкананьне задач другой бальшавіцкай вясны.

Ш.

Камсамол-на перадавыя пазыцыі

змаганьня за першынства!

Сакратарыят ЦК ЛКСМБ абгаварыў пытаньне аб удзеле камсамольскай арганізацыі ў конкурсе на лепшае правядзеньне веснавой пасеўнай кампаніі.

Сакратарыят ЦК настанавіў уключыць усю камсамольскую арганізацыю ў правядзеньне агляду і конкурс на лепшае і пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы. Даручана райкомам і ячэйкам ЛКСМБ забясьпечыць актыўны ўдзел камсамолу ў арганізацыі бядняцка-серадняцкіх мас на ажыцьцяўленьне задач агляду і конкурсу.

ЦК ЛКСМБ прапанаваў камсамольскім арганізацыям забясьпечыць актыўны ўдзел райкомаў і ячэек ЛКСМБ у выкананьні ўмоў конкурсу, памятаючы, што правядзеньне агляду і конкурсу павінна спрыяць мабілізацыі калгасьнікаў, рабочых саўгасаў і МТС на пасьпяховае правядзеньне і скарачэньне тэрмінаў сяўбы.

Сакратарыят ЦК ЛКСМБ высунуў рад сустрэчных абавязкаў па дапамозе ў ажыцьцяўленьні задач агляду. Асноўнымі з іх зьяўляюцца:

Поўны ахоп сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам усіх камсамольцаў і калгаснасаўгаснай моладзі, арганізацыя сацспаборніцтва паміж моладзьмі брыгадамі, уязьдне на буксір адстаючых брыгад. Райкомы і ячэйкі ЛКСМБ павінны заключыць паміж сабою ўмовы на лепшую арганізацыю працы і скарачэньне тэрмінаў сяўбы. Пры актыўным удзеле ўсёй камсамольскай арганізацыі неабходна ў бліжэйшыя-ж дні закончыць перавод усіх калгасаў на зьдзельшчыну і ліквідацыю абязьлічкі ў саўгасах, калгасах і МТС.

Для разгортваньня культурна-выхаваўчай работы ў калгасах, саўгасах і МТС мабілізуюцца **500** актывістаў-камсамольцаў.

Пры кожнай камсамольскай ячэйцы неабходна арганізаваць апэрацыйна-плянавую групу з камсамольцаў і моладзі на падрыхтоўцы сустрэчных плянаў сяўбы і ўборкі.

ЦК ЛКСМБ прапанаваў усёй арганізацыі стварыць пры кожным калгасе ўдарныя брыгады па рамонце ўборачнага інвэнтару, забясьпечыўшы своячасовае і пасьпяховае правядзеньне ўборкі.

Для ўдзелу ў правядзеньні сіласаваньня ЦК настанавіў мабілізаваць 4 тыс. камсамольцаў на работу ў якасьці брыгадзіраў на сіласе.

Мсьціслаўшчына калектывізавана на 52 проц.

Мсьціслаўская раённая партарганізацыя дабілася вялікіх посьпехаў у справе разгортваньня калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Дырэктыва ЦК КП(б)Б аб калектывізацыі Мсьціслаўскай арганізацыяй выканана. НА 15 МАЯ РАЁН КАЛЕКТЫВІЗАВАНЫ НА 52 ПРОЦ.

Ёсьць рад сельсаветаў, калектывізацыя якіх перавышае сярэдні процант раёну. Так, Старасельскі сельсавет калектывізаваны на 87 проц., Падсоптаўскі — на 85 проц., Хлышчоўскі — на 71 проц., Янаўскі — 67 проц., Мазалаўскі — 47 проц. і Шачаўскі — 55 проц. Недапушчальна адстаюць у калектывізацыі Дудчыскі, Курманаўскі, Рыпышчынскі сельсаветы і прыгарадныя вёскі Мсьціслаўскага гарсавету.

Недапушчальным тэй факт, што некаторыя калгасы імкнуцца прыпыніць прыём новых членаў на час палавых работ. З такімі тэндэнцыямі партарганізацыя павінна весьці рашучую барацьбу. Пасьля з гэтым слілы партарганізацыі павінны быць кінуты на дапамогу Дудчыскаму, Курманаўскаму і Рыпышчынскаму сельсаветам, якія ганебна адстаюць у разгортваньні калектывізацыі.

М.

У палоне самацёчных настрояў

ПАРТ'ЯЧЭЙКА БЕЛІЛЬНАСАЮЗУ НЯ СТАЛА НА ЧАЛЕ РЭАЛІЗАЦЫІ ПАСТАНОВЫ ЦК КП(б)Б і СНК АБ МЕРАПРЫЕМСТВАХ ПА НАШЫРЭНЬНІ ПАСЕВУ ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ У БЯГУЧУЮ ПАСЕЎНУЮ КАМПАНІЮ. У СВАЁЙ ШТОДЗЕННАЙ РАБОЦЕ ПАРТ. ЯЧЭЙКА НЕ МАБІЛІЗУЕ ПАРТЫЦЫЯЎ І ЎСІХ РАБОТНІКАЎ АПАРАТУ НА ВЫКАНАЬНЕ ПЛЯНАЎ ПА ПАСЕВУ ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР.

ПАРТ'ЯЧЭЙКА ДА ГЭТАГА ЧАСУ НАВАТ НЕ АБМЕРКАВАЛА ПАСТАНОВЫ ЦК КП(б)Б і СНК. НЕ ПРАВЯРАЕ, ЯК АПАРАТ БЕЛІЛЬНАСАЮЗУ Ў СВАЁЙ РАБОЦЕ ЗАБЯСЬПЕЧВАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ, ВЫЗНАЧАНЫХ ПАСТАНОВАЙ.

МЫ ВЫМУШАНЫ ЗВЯРНУЦЬ УВАГУ МЕНСКАГА ГАРКОМУ КП(б)Б НА СТАНОВІШЧА ПАРТ'ЯЧЭЙКІ БЕЛІЛЬНАСАЮЗУ.

Н. Г — т.

ПАСЫЎНЫЯ НАГЛЯДАЛЬНІКІ

Парт'ячэйкі Калгасцэнтру і Наркамзему нават не абмеркавалі важнейшага палітычнага дакумэнту

Згодна пастанове СНК і ЦК КП(б)Б, апублікаванай 19-га мая, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі павінны весьці рашучую барацьбу супроць тэндэнцый скарачэньня плянаў калтрактацыі засеву ільну і канапель, павінны ўсе сілы накіраваць на пашырэньне плошчы іх засеву.

Здавалася-б, што бюро партыйнай ячэйкі Белкалгасцэнтру разам з мясцкомам павінна было сур'ёзна ўзяцца за прапрацоўку і рэалізацыю важнейшай дырэктывы партыі і ўраду. Пытаньне павінна было быць прапрацавана на партсходах, на шырокіх парадах актыву. Патрэбна было мабілізаваць супрацоўнікаў апарату для таго, каб пераключыцца на важнейшы і адказьнейшы вучастак работы.

Партыйная ячэйка Белкалгасцэнтру павінна была прасачыць га тым, ці своячасова дырэктыва СНК і ЦК спушчана ў нізавыя зьвяньні раёну, ці забясьпечана яе выкананьне. Абавязак кожнага камуніста праверыць, як на мясцох выконваюцца дырэктывы партыі і ўраду.

Аднак, бюро партыйнай ячэйкі Белкалгасцэнтру не зразумела важнасьці пастановы, не абгаварыла яе ні толькі шырока ў апараце, але гэтага пытаньня нават не абгаварыла на бюро ячэйкі.

Сакратар партыйнай ячэйкі тав. Паборцаў лічыць, што калі пастановы апошняга пленуму ЦК абгавораны на адкрытым партыйным сходзе, на якім, між іншым, гаварылі аб ільне і канаплях, дык няма асаблівай патрэбы зараз аб гэтым гаварыць.

Такую ўстаноўку інакш, як праваапартуністычнай, кваліфікаваць нельга. Як сакратар, так і бюро ў цэлым ня ведалі ці пасланы ўказаньні райкалгасаўзам аб выкананьні пастановы ЦК і СНК. Між іншым, толькі 25 мая Белкалгасцэнтр пасылае напамінаньне раёнам, каб апошнія прачыталі (?!) у «Зьвязьдзе» пастанову СНК і ЦК.

Калі партыйная ячэйка ня ведае, што робіцца ў апараце, ня цікавіцца яго работай, то няма чаго дзівіцца, што яна ня ведае, што робіцца на мясцох, як выконваюцца там дырэктывы Белкалгасцэнтру.

У паасобных раёнах ёсьць простае зьмазваньне прарываў. Характэрным зьяўляецца ў гэтай справе Лагойскі раён, які павінен засеяць ільну 459 гэкт. Гэтага заданьня райкалгассаюз ня прыняў. Ён намеціў «свой плян» у 218 гэкт., а ў зводны паведамляе, што заданьне выканана на 92,3 проц. Такім чынам апартуністычны плян выканан на 92,3 проц., а рэальнае заданьне Белкалгасцэнтру выканана толькі на 43 проц.

Апартуністы з Лагойскага райкалгассаюзу таксама скарацілі плян сяўбы канапляў. Заданьне было 154 гэкт., яго давялі да 76 гэкт. Цяпер апартуністы радуюцца, што быццам-бы іх плян выкана на 90 проц. у той час, як яны выканалі ўсяго на 44 проц.

Любаньскі раён па засеве канапель атрымаў заданьне ў 200 гэкт., выканаў 238, або закантрактавана 119 проц. Па кантрактацыі-ж ільну заданьне зьмяншана РВК на 100 гэкт.

Чаму аб гэтым усім ня ведае бюро партыйнай ячэйкі Белкалгасцэнтру? Чаму маўчаць камуністы, якія выяжджаюць на раёны? На гэта пытаньне можна адказ знайсьці ў тым, што бюро партыйнай ячэйкі ня здолела мабілізаваць партыйцаў апарату на барацьбу супроць апартуністаў, якія ў раёнах скарацілі пасеўныя пляны ільну і канапель.

Такое-ж становішча і ў Наркамземе. Аб пастанове СНК і ЦК ня ўсе ведаюць. Бюро партыйнай ячэйкі бязьдзейнічае. Мясцком таксама. Старшыня мясцкому Кесараў на пытаньне, чаму важнейшая партыйная дырэктыва не абгаворана на сходах супрацоўнікаў, адказаў:

— Беспартыйны я, ня ведаю, што рабіць.

Сакратар парт'ячэйкі **Арлоўскі** дзівіцца: «што можна рабіць, калі члены бюро ў разьезьдзе?»

Людзі страцілі галаву. Ня ведаюць таго, што калі не на бюро, дык на партыйным сходзе можна і патрэбна абгаворваць пастановы партыі і ўраду для таго, каб кіраваць работай на мясцох.

Мы ставім пытаньне: чым-жа займаюцца партбюро Наркамзему і Белкалгасцэнтру? Чаму да гэтага часу ня выкананы дырэктывы партыі адносна перабудовы работы з мэтай павароту гэтарам да вытворчасьці?

А. С—ны.

Рыхтаваць кадры

для ільнаапрацоўчай прамысловасьці

У бягучым годзе па Савецкім Саюзе будзе пабудавана 489 заводаў па першапачатковай апрацоўцы ільну і канапель. Гэтыя прадпрыемствы разам з тымі, якія ўжо існуюць, здолеюць на 33 проц апрацаваць ураджай ільну і на 20 проц. ураджай канапель. У БССР будуць пабудаваны 42 ільняныя і 3 пяньковыя заводы. Яны будуць пушчаны ў ход да 1-га студзеня 1932 году.

Будаўніцтва прадпрыемстваў па апрацоўцы тэхнічных культур выклікае неабходнасьць падрыхтоўкі тэхнічных кадраў і кваліфікаванай рабочай сілы. Для 489 новых заводаў трэба падрыхтаваць каля 10.000 чал. Усесаюзны трэст «Ільнапяньнаапрацоўка» ў бліжэйшы час для падрыхтоўкі гэтых кадраў разгортвае сетку курсаў на 4.473 чал. і ўводзіць брыгаднае і індывідуальнае вучнёўства на 5.379 чал. на ільнапяньковых заводах. З гэтай лічбы на БССР прыпадае 418 чал. і праз вучнёўства трэба падрыхтаваць 506 чал. Гэта колькасьць патрэбных кадраў разьмяркоўваецца так: дырэктароў - тэхнікаў — 46 чал., кіраўнікоў зьмен — 138, сартоўшчыкаў — 322, мачыльшчыкаў — 4, машыністаў — 184, качэгараў — 184 і рахункаводаў — 46 чал.

Падрыхтаваць гэтыя кадры, укамплектаваць курсы і разгарнуць падрыхтоўку праз вучнёўства мы зможам толькі ў тым выпадку, **калі партыйныя арганізацыі, асабліва ільнаводчых раёнаў, гэтаму пытаньню нададуць значэньне, якое яно ў нашых умовах набыло.**

Партыйныя ячэйкі ільнаводчых калгасаў і саўгасаў павінны аказаць належную дапамогу адпаведным арганізацыям у справе падбору адпаведных кандыдатур на курсы.

Частка курсаў у пачатку мая павінна была пачаць сваю работу. Але з боку трэсту няма належнага інструктаваньня ў гэтай важнейшай справе. На тэлеграфныя запытаньні ўпаўнаважанага Галоўлепкому наконт падрыхтоўкі кадраў трэст нават не адказвае. Гэта недапушчальныя зьявішчы. Партыйныя арганізацыі павінны неадкладна правяць стан работы і правядзеньне мерапрыемстваў па падрыхтоўцы кадраў.

Ш—кі.

Тэхкультуры на складах... не растуць

ДРЫСЕНСКІ раён ільнаводчы. Гэта гаворыць аб тым, што партыйная арганізацыя і ўсе іншыя ўстановы і аб'яднаньні павінны сваю работу падпраднаваць задачам пашырэньня пасеўнай плошчы пад тэхнічнымі культурамі, задачам выкананьня праграмы другой бальшавіцкай вясны.

Для ажыцьцяўленьня гэтай асноўнай задачы павінны быць скарыстаны ўсе магчымасьці, усе сілы і сродкі. Прагледзім, як-жа райкалгаспілнасаюз скарыстоўвае гэтыя магчымасьці. На складах райкаапільнасаюзу ляжыць каля 200 тон ільнасемя. Ляжыць з мінулага году 120 тон і 140 тон завезена ў бягучым годзе. Рэалізавана-ж усяго 60 тон. На рушэньні складаў і дзесяткі тон іншых культур. На станцыі Дрыса не выкупляюцца пасеўныя грузы (вугаль, угнаеньне, боераны, пемзы і інш.). На ўсе гэтыя рэчы калгасы адчуваюць вялікую патрэбу. Райкаапільнасаюз-жа тлумачыць:

— Нама грошай, ліміт перавыканан з перавышэньнем на 225.000 руб.

У гэты-ж самы час на складах райкаапільнасаюзу ляжаць тавары на дзесяткі тысяч рублёў і не рэалізуюцца.

Партыйная арганізацыя павінна нанесьці рашучы ўдар па гэтых ганебных фактах. Трэба паказаць гаваўцянам, што тэхкультуры на складах не растуць.

У той час, калі калгасы адчуваюць патрэбу ў насеньні, калі партыя пастаніла задачу пашырыць пасеўную плошчу тэхнічнымі культурамі, на дрысенскіх складах ня можа ляжаць насеньне без нілкага руху. Калі яно ня можа быць высеена калгасамі раёну, трэба неадкладна арганізаваць перакідку яго ў калгасы і саўгасы іншых ільнаводчых раёнаў.

У гэту справу трэба неадкладна ўмяшацца дрысенскай КК-РСІ і пракуратуры з тым, каб пакласьці канец тым ганебным зьявішчам, якія пануюць у райкаапільнасаюзе.

Кралошын С.

На мёртвым пункце

ГАРАДОК. (НАШ КАР.). РАЗГОРТВАНЬНЕ ПАЗІЎНЫХ РАБОТ НЯ ЎНЕСЛА АДПАВЕДНАГА ЗРУХУ Ў ПАВЫШЭНЬНІ ПРОЦАНТУ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ. ЕН ЗАСТАЕЦЦА НА АДНЫМ УЗРОЎНІ (12 ПРОЦ). УСЕ ЎМОВЫ ДЛЯ ПАСЬПЯХОВАГА РАЗГОРТВАНЬНЯ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ Ў НАЯЎНАСЬЦІ. РАЙПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ БАЯЗДОЛЬНАЯ І МАЕ ДОСЬЦЬ МОЦНЫХ АКТЫЎ. У РАЁНЕ ЕСЬЦЬ МТС.

У ЧЫМ-ЖА ПРЫЧЫНА ТАКІХ СЛАБЫХ ТЭМПАЎ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ?

ПРЫЧЫНА Ў НЯЎМЕНЬНІ АРГАНІЗАВАЦЬ МАСЫ ВАКОЛ ПАЛІТЫЧНЫХ ЗАДАЧ. НЕДААЦЭНЦЫ ПАЛІТЫЧНА-МАСАВАЯ РАБОТЫ Ў РАЁНЕ. НЕ ПРАВЕДЗЕНА ПА КАЛГАСАХ АДПАВЕДНАЯ РАБОТЫ ВАКОЛ ЗАДАЧЫ РАЗГОРТВАНЬНЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА, АБВЕШЧАНАГА ЦК КП(б)Б У СВАЁЙ НАСТАНОВЕ АД 10-ГА МАЯ.

РАЙПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ НЕ СКАРЫСТОЎВАЕ І НЕ ПЕРАНОСІЦЬ ВОПЫТУ ПЕРАДАВЫХ СЕЛЬСАВЕТАЎ, ЯКІЯ Ў РЭЗУЛЬТАЦЕ РАШУЧАГА НАЦІСКУ НА КУЛАЦКІЯ ЭЛЕМЭНТЫ ДАБІЛІСЯ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ 42 ПРОЦ ВЯДНЯКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК (АЛЯКСАНДРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ).

НА ЗЬДЗЕЛЬЧЫНУ З 75 КАЛГАСАЎ РАЁНУ ПЕРАВЕДЗЕНЫ ТОЛЬКІ 28. АЛЕ І ТЫЯ, ШТО ЛІЧАЦЦА ПЕРАЙШОЎШЫМІ НА ЗЬДЗЕЛЬЧЫНУ, ВУЖЫВАЮЦЬ ЯЕ ФАРМАЛЬНА, НЕ КАРЫСТАЮЦЦА БРЫГАДНЫМІ МЭТАДАМІ РАБОТЫ.

ГРАФСАЮЗЫ НЕ ПЕРАКЛЮЧЫЛІСЯ НА АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ Ў САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ. РАЕННАЕ КІРАЎНІЦТВА ПРАФСАЮЗУ Ў ГЭТЫХ ВАЖНЕЙШЫХ ПЫТАНЬНЯХ ПРАЯЎЛЯЕ АПАРТУНІСТЫЧНУЮ ПРАКТЫКУ. НЕ МАБІЛІЗУЕ ПРАФСАЮЗНАЯ МАСЫ І А РАЗГОРТВАНЬНЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА.

РАЕННАЯ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ ПАВІННА НЕАДКЛАДНА РАЗГАРНУЦЬ РАБОТУ НА АРГАНІЗАЦЫІ НОВАГА КАЛГАСНАГА ПРЫЛІВУ, ПА МАБІЛІЗАЦЫІ МАС ВАКОЛ ЗАДАЧЫ ПАШЫРЭНЬНЯ ПЛОШЧЫ ПАСЕВУ ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР, ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ.

ШАРУБА.

Аб профілі спэцыялістаў-плянавікоў*)

У гістарычную эпоху, калі ўступіўшая ў перыяд сацыялізму краіна гарыць энтузіязмам вялікай, небачанай па сваім размаху і па сваім гістарычным значэньні будоўлі, калі рабочая кляса пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі завяршае пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі — роля і значэньне работы Дзяржпляну і ўсёй плянавай сыстэмы набывае сапраўды гігантыкае значэньне.

Значэньне плянагага пачатку ў сучаснай эканоміцы настолькі ўзмацняецца, што набывае ролю **першачарговага фактару** ва ўсім сацыялістычным будаўніцтве. Тэмп развіцьця народнай гаспадаркі ў вялікай ступені залежыць ад плянавай работы, ад ступені правільнасьці складаньня і **бальшавіцкага выкананьня** плянаў кажсобных галін і ўсёй сацыялістычнай гаспадаркі ў цэлым.

Недарма шкоднікі, выконваючы волю сусьветнай буржуазіі, прабавалі ў першую чаргу нанесьці ўдар па плянавай сыстэме і іменна тут імкнуліся зьвіць сабе трывалае гняздо. Гэта з яшчэ большай сілай падкрэсьлівае **бавы клясавы** характар плянаваньня, што патрабуе настайнага ўвартага пераманьня супраціўленьня клясавых ворагаў.

У справе належнай пастаноўкі плянавай работы першачарговае значэньне набывае **ПРАБЛЕМА ПАДРЫХТОЎКІ ПРАЛЕТАРСКІХ КАДРАЎ ПЛЯНАВІКОЎ.**

Наяўны склад гэтых кадраў надзвычай малы і паміж патрэбнасьцю і наяўнасьцю ёсьць разрыў значнага маштабу.

«Праблема плянавых кадраў зьяўляецца ў цяперашні час рашаючай цэнтральнай праблемай. І гэта пытаньне ставіцца ня толькі таму, што размах сацыялістычнага будаўніцтва гігантыкі павялічыўся, гэта, вядома, асноўная прычына, але тут мае яшчэ значэньне і бясконцая колькасьць здраднічтваў з боку буржуазных спэцыялістаў. Шкодніцтва надзвычай аб

Пятую частку Ўсесаюзнай прадукцыі сьвінагадоўлі ПАВІННЫ ДАЦЬ СЬВІНСАЎГАСЫ БССР—

гэта задача можа быць ажыцьцёўлена толькі пры ўмове сваячасовага выкананьня саўгасамі сваіх пасеўных плянаў, неадкладнага ўкараненьня зьдзельшчыны, фарсаваньня ўкамплектаваньня і разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва

Права на сонца

У Сьляпянцы за пыльным Менскам, ля прыгожага парку выстраіліся як на парадзе, будынкі сьвінога гарадка навукова-дасьледчага інстытуту па сьвінагадоўлі. У Сьляпянцы — адзін з цэнтраў тэарытычнай і тэхнічнай работы па вырашэньні праблемы сацыялістычнай сьвінагадоўлі.

У кожным сьвінарніку — дасьледчая лябараторыя.

Сьвінарнік № 2: тут апаросныя сьвіньні — свяласаблівы радзільны дом для сьвіноматак. Ля матак капошацца маленькія парасяты. Асноўнае дасягненьне інстытуту — значнае зьніжэньне адыходу парасят. 12 проц.—сярэдні адыход парасят інстытуту, 25 проц. адыход парасят, узаконены тэарытычнымі падручнікамі. 12 і 25 зьмлітуда значная і вельмі паказальная для падагульваньня работы па гадоўлі сьвіней.

Што дапамагло атрымаць такія перамогі? Вельмі простыя, але зусім неабходныя ўмовы: памяшканьні — сухія, цёплыя, чыстыя; утрыманьне і парасят, і дарослых сьвіней у чыстаце і рацыянальнае скарыстаньне кармоў.

У дасьледчых лябараторыях

На вялікіх, шырокіх вуліцах сьвіннога гарадка пустэльна і ціха. Усе сьвіньні жыхары гарадка зараз прымаюць сонечныя ваны. На зялёных дываноў пашы інстытуту бясклопатна рыюцца ў зямлі. Зьніклі зусім, так моцна засеўшыя ў быце малюнкі: вялікая лужына, а па сярэдзіне яе ў балоце раскашуецца сьвіня. У сьвінарніках, як і на ўсёй тэрыторыі сьвіннога гарадка, адменная чыстата. У станках — сьвежая пасьцілка. Чыста прыбраны цэмэнтныя падлогі праходаў.

У станках—патомкі вахудалых сьвіней. Як далёка адышлі гэтыя Марусі і Агаты ад сваіх матак. Адзін толькі правільны догляд, плюс чыстата, плюс рацыянальнае скарыстаньне кармоў далі свае вынікі. Маткі важылі па 3 пуды, а патомства ў першым пакаленьні важыць па 10 пудоў. Рост вагі ў 3-4 разы.

У навукова-дасьледчай рабоце мэтызацыя займае начэснае месца. У сьвінарніках мірна ўжываюцца доўгія породзістыя англічанкі з белымі немкамі, шведкі з беларускамі — страката пярэстымі.

У кожным сьвінарніку дасьледчая работа па асобнай галіне. У двох сумежных станках дзьве групы сьвіней аднолькавай вагі, пароды, сытасьці і ўзросту. Адна група харчуецца выключна сухой ядой, запіваючы чыстай вадою. У мэню другой — рэдкая кашка. Якое кармленьне дасьць лепшыя вынікі? Якая група лепш выгадуецца, прыбавіцца ў вазе, лепш сябе будзе адчуваць? Над вырашэньнем гэтых пытаньняў працуюць дасьледчыкі.

У спэцыяльна адведзеным сьвінарніку фізіолёгічна-вощытная лябараторыя. Сьвіньні нярухома ляжаць, спавітыя вяроўкамі. Пры ўваходзе дзяўчына ў белым халаце па рэцэптах рыхтуе сьнеданьне. На сталок вымяральныя прылады, даведнікі.

Кухня — тая-ж самая дасьледчая станцыя. У кармленьні сьвіней ужо даўно ліквідавана абязьлічка. Кожнай сьвіньні асобная порцыя, асобная страва. У вялікіх гэрмэтычна закрытых баках пры дапамозе пары рыхтуецца сьнеданьне. Добра вымытыя вёдры расстаўлены радамі.

Сьвіней прывучылі есьц« у вызначаны тэрмін. Сьвіней прывучылі да чыстаты як у сьвінарніках, так і на тэрыторыі гарадка, есьці толькі з чыста вымытага начыньня. Іх прывучылі ляжаць ня проста на падлозе, а на спэцыяльных драўляных памостах. Адкінута бесшабасна - беспарадчае кармленьне сьвіней. Кожная сьвіня атрымлівае харчамі патрэбную колькасьць вітамінаў і бялкоў. Ад таго і растлусьцелі так патомкі захудалых сьвіней, ад таго і вывадкі парасят моцныя і трывалыя.

У кожным сьвінарніку вага: вялікая і малая. Яны тут таксама патрэбны, як і ў любой капэрацыйнай краме. Бо вага гэта асноўны сродак уліку.

Раўненьне на штаб навукова-дасьледчай работы па сьвінагадоўлі павінны браць сьвінаводчыя саўгасы і калгасы. Са сьвінарнікаў - лябараторый вопыт станцыі ва ўсёй шырыні павінен распаўсюджвацца па БССР.

На сьвінсаўгасы рэспублікі ўскладзена адказная задача — даць 20 проц.— 1/6 усёй сьвінаводчай прадукцыі Ўсесаюзнага Сьвінавода.

86 маладых сьвінаводчых калгасаў і ўвесь наяўны арсэнал Сьвінаводтрэсту яшчэ ня ўзялі належных тэмпаў. Яны даюць толькі 35 проц. ад сваіх плянаў.

У чым прычыны прарываў?

Аб зьдзіўляючых рэчах гаварылі старшыя сьвінары саўгасу Сьвіноводу на сваёй нарадзе, якая адбылася на днях у Сьляпянцы. Яны азнаёміліся з пастаноўкай работы у НДІ, заслухалі інструкцыйныя даклады кіраўнікоў інстытуту, жорсткія словы праўдзівага абвінавачаньня, якія сказаў тав. Аўчыньнікаў, потым гаварылі пра сваё — набалеўшае.

Нарада адбывалася на муражыне, у прыгожым парку інстытуту. Сонца, як яму па штату паложана, здорава прыпякала з вышыні. А сьвінары — удзельнікі нарады—скардзіліся на «недахват сонца».

Сонца і пашы

Тав. Жук з саўгасу Халопенічы, расказаў, як дзякуючы таму, што выпусьцілі сьвіней на пашу, адвялі нагрозу падзяжу сьвіней ад чумы. Сонца патрэбна сьвіням, як ахова ад хвароб, як магутны сродак здароўя і росту. А ў шмат якіх саўгасах яшчэ і на сёнешні дзень сонца баяцца. У саўгасах «Ледняцы», «Вызваленьне», «Зялянкі», сонца даецца сьвіням у карыстаньне па чарзе, як дэфіцытны тавар. Гэта не анэкдот, а факт.

У шмат якіх саўгасах сьвіньні зусім ня бачаць сонца, сядзяць у хлявох, запёртымі, у вільгаці. І іменна ў гэтых саўгасах больш чым дзе-б там ні было ўзрастае процант падзяжу сьвіней.

У саўгасах «Будзённага», «Антонаўская», «Старая-Беліца» з-за недахвату памяшканьня зімою сьвіньні мерзьлі на дварэ, а ўлетку сьвіней схавалі ў хлявы ад сонца. Гэта-ж верх бяглузьдзіны. У «Насовічах» да 18 мая сьвіней не выпускалі на пашу і на сонца.

А ў некаторых саўгасах кіраўніцтва, запятае, бязумоўна, важнай кампаніяй — веснавой сяўбой, зусім забылася пра ня менш важнае — пра сьвіней.

— У нас зараз веснавая кампанія, сьвіньні пачакаюць.

Зусім забыліся, што веснавая сяўба ў сьвінаводчых саўгасах праводзіцца іменна ў мэтах разьвіцьця сьвінагадоўлі і што сьвіньні ў чаканьні дырэктарскай увагі могуць з жыцьцём разьвітацца.

Чаму прагулялі сьвінаматкі?

І сапраўды, ў чаканьні такой дырэктарскай увагі палова ўсіх матак сьвінаводчых саўгасаў рэспублікі засталася непакрытай і пагульвае ўхаластую. Гэта азначае, што дзесяткі тысяч парасят выпадуць з лічбаў выкананьня прамфінпляну.

А хіба дзе ў партыйных ячэйках, рабчкомах, грамадзкасьці саўгасаў гэта атрымала належную ацэнку?

Мала сабрадь матак, укамплектаваць стада імі. Трэба, каб маткі, гэтыя сьвіньныя варштаты, поўнасьцю выконвалі свой прамфінплян. Бо прагул аднэй сьвінаматкі — удар па прамфінпляне.

У праграмах вялікіх работ па сьвінагадоўлі ў БССР саўгасам дано заданьне: 40 тысяч таварных сьвіней здаць дзяржаве ў гэтым годзе. Сьвіное стада к канцу году павінна мець 200 тыс. галоў.

Поўнае і безагаворачнае выкананьне гэтых паказальнікаў ёсьць бярацьба за 12 таварных сьвіней штогод ад кожнай маткі.

Змог-жа інстытут, клапаціва працуючы над выхавньнем парасят, зьнізіць адыход парасят да 12 проц. У саўгасе-ж «Сталіна» процант адыходу парасят ня менш 38. Ды і ў многіх іншых саўгасах ня лепш. У адным саўгасе выдумалі такі мэтад, што парасят запісвалі праз 10 дзён пасьля нараджэньня, тады як найбольш слабыя парасяты ўжо разьвіталіся з жыцьцём. Ад гэтага, вядома, штучна зьніжаўся процант адыходу парасят. Мастакі такіх пахаджэньняў яшчэ «не прэміраваны» адпаведнымі спагнаньнямі і стварэньнем грамадзкага адпору.

Ёсьць выпадкі--няма сыстэмы

Работа сьвінароў у саўгасах на зьдзельшчыну яшчэ поўнасьцю не пераведзена. Прэміяльнай сыстэмы ўсюды таксама няма. Ёсьць толькі выпадкі прэміраваньня, а ня сыстэма. Аб непасрэдных тэхнічных выканаўцах — цэнтральных фігурах у сьвінсаўгасах — сьвінарох, трэба значна больш клапаціцца і ствараць сапраўдныя ўмовы для работы.

Мала мець жаданьне працаваць, трэба ўмець працаваць. Сьвінары павінны ўладаць тэхнікай і ў гэтай справе значную ролю можа адыграць інстытут сьвінагадоўлі. У парадак дня работы навукова-дасьледчага інстытуту трэба ва ўсю шырыню паставіць пытаньне аб арганізацыі спэцыяльнага аддзелу інструктажу непасрэдных работнікаў сьвінагадоўлі на аўладаньні імі тэхнікай.

Баявы загад партыі аб бярацьбе аа сацыялістычную жывёлагадоўлю будзе з яшчэ большым посьпехам выканан тады, калі кожны сьвінсаўгас стане пізавой ячэйкай навукова-дасьледчага інстытуту сьвінагадоўлі, будзе інстытутам для суседзяў — для калгасаў.

Інстытут па сьвінагадоўлі ў сваёй рабоце на гадоўлі сьвіней базуецца на вельмі простых, але цалкам неабходных умовах. Першае, памяшканьні: сухія, цёплыя і чыстыя, чыстата абавязковая ўмова як для памяшканьня, так і для яго жыхароў, рацыянальнае скарыстаньне кармоў.

Дасканалае праветрываньне сьвінсаўгасаў, сухасьць, — датычаць ня толькі сьвінарнікаў і іх жыхароў, але і канцылярыі дырэкцыі, таксама з іх жыхарамі, іх таксама трэба здорава праветрыць, неадкладна зьнішчыць вільгаць, асушыць бюракратычнае балота, коснасьць і бюракратызм у адносінах да сьвіней.

Рацыянальна скарыстоўваючы кармы, не забываць пра сонца. Сьвіня мае ўсе правы на сонца, на поўную норму сонца, без чаргі.

І наогул памятаць: сьвінагадоўля гэта не кампанія, аб якой забываюць у часе другіх кампаній. Сьвіньня варштаты, фабрыкі мяса павінны даваць поўнацэнную прадукцыю краіне.

А. Л.

Удзельнікі нарады старшых сьвінароў саўгасаў БССР

1) **Заранчук Марыя**—старшы сьвінар саўгасу «Вызваленьне», Сьнілавіцкага раёну, ударніца, рабкорка газэты «Сельска-гаспадарчы рабочы», член рэдкалегіі насьценнай газэты. Брыгада, якой кіруе т. Заранчук, паказвае лепшыя прыклады дысцыплінаванасьці і нарадку ў рабоце. 2) **Шаршнёў Пётра**. старшы сьвінар саўгасу «Вачэйкава», Бешанковіцкага раёну. Ударнік, сакратар ячэйкі валяўных бязбожнікаў. Кіруе работай клюбу. 3) **Дзятлова Надзея**. Ударніца. Тэхнік саўгасу «Блон». 4) **Пятневіч Станіслаў**—старшы сьвінар 1-га вучастку саўгасу «Луцэўўшчына», Лагойскага раёну. Ударнік. 5) **Жук**—старшы сьвінар саўгасу «Халопенічы». Член КП(б)Б. Па яго ініцыятыве ў гэтым годзе дзякуючы выводу на поле сьвінога стада адхілена пагроза зараженьня ўсяго сьвінога стада чумой. Ударнік.

На шляху да перамогі

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Калгас «Чырвоны партызан», Лядзенскага сельсавету на сваёй вытворчай нарадзе настаяжу ўключыцца ў конкурс на лепшае і хутчэйшае сканчэньне веснавой сяўбы.

У ўлым годзе толькі дзесятак бедняцкіх складаў ядро калгасу. Рашучае наступленьне на кулака, масавая работа партыйнай ячэйкі, згуртаваўшасьць саміх калгасьнікаў далі новы прыліў. 4 мая выйшла на калгаснае поле ўжо ня 10, а 46 бядняцка-сераднцкіх гаспадарак вёскі Лиды.

Калгас маленькі, але працуе дружна. Замест 108 гэкт., вызначаных паводле плану для засеву пад яравы клін, калгасьнікі пераняшлі засеяць 145 гэктараў. Асаблівы ўпор робіцца на кармавыя травы і кораньплоды.

Ня гледячы на недахват цягавай і людзкой рабочай сілы, калгас, павышаючы інтэнсыўнасьць працы, імкнецца скончыць сяўбу да 1 чэрвеня, ідзе на дапамогу суседзям, якія адстаюць.

Зьдзельчына, улік колькасьці і якасьці работы ў працаднёх узьнімае энтузіязм калгасьнікаў, ператварае калгас у «сквозную» ўдарную брыгаду.

14 мая выйшлі сеяць з таўкач расстаноўкай сіл: 5 мужчын накідаюць гной на калёсы, 10 жанчын на 10 фурманках адвозяць яго на поле. 4 жанчыны разьбіваюць гной, 6 аратых працуюць на нараконных плугох; 15 жанчын садзяць бульбу; 2 жанчыны і 2 мужчын падвозяць і 6 жанчын рэжуць бульбу.

За два дні калгасьнікі засеялі 11 гэкт. бульбы. Дух бадзёры, бо ведаюць, што працуюць на сябе Прыкладная норма Калгасцэнтру на пасадцы бульбы ў яму Калгасцэнтру на пасадцы бульбы ў яму — 0,14 гэкт. Гэту норму ня топьбаразну — 0,14 гэкт. Гэту норму ня топькі перавысілі, але дасягнулі нябачнай пічбы — 0,36 гэкт. на чалавека.

94 чалавекі — наяўны склад рабочай сілы, разьбіты на 6 брыгад. Зараз цэнтральнай фігурай зьяўляецца брыгада 10 аратых — ударнікаў. Да іх прымацаваны 10 плугоў і 20 коняй.

Шустры, энэргічны дзядуля, пелявод Мікола Бабіч ведае адно: «павысіць урадлівасьць калгасных палёў». У яго ўсё пасеньне ачышчана і пратручана. 45 гэктараў засяваецца выключна гатункавым насеньнем аўса «Пабеда». Выкарыстоўваюцца 150 цэнтнэраў штучнага ўгнаеньня. Сенажаць ужо ачышчана ад гапьля і каменьня, на 10 гэктараў вырваны карчы і адрэзаны кочкі.

У памяшканьні праўленьня вісіць спіс усіх калгасьнікаў. Супроць прозьвішчаў тых, што не зьявіліся на работу, ставіцца чорная пляма, да найбольш злосных ужываюцца мэтады іншага спагнаньня. Маладых хлапцоў Бабіча, Сідара і Нахця Сяргея, якія нядбайна адносіліся да сваіх абавязкаў, ад чаго машына на рэзцы працавала з перабоямі, на першы раз пакаралі тым, што не запісалі ім працадзён. Сход калгасьнікаў вошлескай сустрэў гэту прапанову праўленьня. Над грамадзкім уплывам калгасьнікаў гультаі, прагульчыкі, нядбайнікі выпраўляюцца і імкнуцца сумленна выконваць свае абавязкі.

Калгас «Чырвоны партызан» заканчтраваў усе пасевы.

Калгас бярэ на грамадзкі буксір суседні саўгас «Маладая гвардыя». Ён можа і павінен адказваць чырвоны сьцяг на конкурсе

Чэрвень.

В. Воінаў.

КАМСАМОЛЬЦЫ— У СЬВІНАСАЎГАСЫ!

Сакратарыят ЦК ЛКСМБ абгаварыў пытаньне аб удзеле камсамольскай арганізацыі ў двухдэкадніку ліквідацыі прарываў у саўгасах «Сьвінавода».

Сакратарыят ЦК абавязаў райкомы і ячэйкі ЛКСМБ да 5 чэрвеня скончыць мабілізацыю камсамольцаў у саўгасы «Сьвінавода», выканаўшы поўнасьцю раней даную разьвёрстку.

У тых раёнах, дзе ёсьць саўгасы «Сьвінавода», камсамольская арганізацыя павінна забясьпечыць сваячасовую расстаноўку рабсілы, арганізаваць ударныя маладзёжныя брыгады і апэрацыйна-плянавыя групы.

Камсамольскія ячэйкі павінны дамагацца лепшых паказальнікаў працы, павялічэньня норм выпрацоўкі, увядзеньня зьдзельшчыны. Трэба разгарнуць сацспаборніцтва паміж ячэйкамі на лепшае правядзеньне двухдэкадніка.

ЦК даў дырэктыву ячэйкам аб неабходнасьці 100-процантнага выкананьня гаспадарча-фінансавых плянаў саўгасаў, павялічэньня стада і захаваньня маладняка. Ячэйкі і пілнэр-атрады бяруць шэфства над пасобнымі сьвінарнікамі.

Пытаньні рацыяналізацыі і вынаходніцтва павінны заняць галоўнае месца ў рабоце арганізацый. ЦК даручыў ячэйкам арганізаваць абор рацыяналізатарскіх прапаноў, арганізаваць агра-зоатэхнічныя гурткі па вывучэньні тэхнікі вядзеньні сьвінагадоўлі.

Аб ходзе сяўбы на 20 мая 1931 г.

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б і СНК БССР

1. Адзначыць недапушчальна слабае разгортваньне тэмпаў сяўбы па рэспубліцы па ўсіх сэктарох і простую пагрозу зрыву сканчэньня сяўбы ва ўстаноўленыя тэрміны.

2. Гэта сьведчыць аб тым, што ў раёнах ня прымаецца неабходных мер да павышэньня тэмпаў сяўбы. Рад раёнаў усё яшчэ спасылаецца на розныя аб'ектыўныя прычыны, якія тармозяць ход сяўбы, замест змаганьня за павышэньне яе тэмпаў, што ЦК і СНК расцэньваюць як праяўленьне правага апартунізму. ЦК катэгарычна асуджае пазыцыю тых раёнаў, якія, ня гледзячы на дрэнны ход сяўбы, усё яшчэ супакойваюча інфармуюць ЦК славеснымі г утаркамі аб тым, што «ўся плошча, нахечаная па плянс, будзе засеяна», замест паказаў гэтага на справе.

3. Выходзячы з гэтага, прапанаваць раённым камітэтам партыі і пэрсанальна сакратарам райкомаў і старшыням РВК пад іх адказнасьць, на падставе неаднаразовых дырэктыў ЦК, прыняць усе захады да павышэньня тэмпаў сяўбы, спыніўшы адкліканьне актыву з вёсак, мабілізаваць усё здольнае з раёнаў і кінуць у вёскі, скарыстаць сацспаборніцтва і ўдарніцтва, як магутны сродак за выкананьне плянаў сяўбы.

4. Абвясьціць суровую вымову Багушэўскаму і Церахаўскаму райкомам партыі за непрадстаўленьне вестак аб сяўбе.

Кераванодзецы Бальшавіцкіх вясон

Крупейкаўскі сельсавет заканчвае сяўбу

ЛОЕЎ, 20. (Наш кар.).

Крупейкаўскі сельсавет паставіў перад сабой задачу скончыць сяўбу да 22 мая. Гэта задача сельсаветам амаль што выканана. На пэрадзе ідзе КАЛГАС ІМЯ СТАЛІНА, які па радзе культур ужо перавыканаў плян сяўбы. Так, замест вызначаных плянам 4 гэкт. пасеву ільну, засеяна 9 гэкт., канапель замест 2—4, ячменю замест 4—7 гэкт., аўсу замест 20 гэкт. — 34.

Падцягнуліся і аднаасобнікі, большасьць якіх таксама заканчвае сяўбу.

Бальшавіцкія тэмпы сяўбы ў аснэўным тлумачацца пераходам калгасу на зьдзельшчыну.

Крупейкаўскі сельсавет першы ў раёне выканаў кантрактацыю яравых. Калгасьнікі пасьля сканчэньня сяўбы пераключаюцца на дапамогу прыгарадным гаспадаркам.

М. Р.

У глыбокім тыле

Злачыннае скарыстоўваньне трактарнага парку

СЛУЦАК, 23. (Па тэлефону ад наш. спэцкар.).

Слуцкая МТС на працягу веснавой сяўбы сіламі ўласнага трактарнага парку, паводле пляну, павінна заарань 2.250 гэкт., а разам з конскай сілай — 7.400 гэкт. На 20 мая трактарным паркам заарана 580 гэкт. — 24,8%.

Нормы выпрацоўкі трактарам 4,5 гэкт. сыстэматычна ня выконваюцца. За 21 гадзіну рабочага дня трактар заворвае ня больш чым 2—2½ і, самае большае 3 гэктары.

Такое становішча на МТС тлумачыцца перш за ўсё тым, што з боку дырэкцыі няма дакладнага, выразнага кіраўніцтва, няма адпаведнай правільнай расстаноўкі сіл, кантролю за добраякасным рамонтам і праверкі работы трактарыстаў. Кіраўніцтва прабуе вытлумачыць прарыў у рабоце зусім малай кваліфікацыяй трактарыстаў, аношанасьцю трактарнага парку і г. д. У сапраўднасьці-ж прычыны хаваюцца зусім у іншым. Ні адзін з трактарыстаў не пераведзен на зьдзельшчыну, ні адзін ня прыцягнут да адказнасьці за неахайныя адносіны да трактараў, ні адзін з лепшых ударнікаў не прэміраваны. Прастої дасягаюць вялізарнай пічбы. Трактары прастойваюць цэлымі днямі з-за непадвозу гаручага, адсутнасьці запасных частак і г. д. Дакладнага ўліку прастояў і іх прычын няма. Трактары былі выведзены з поле, калі яшчэ нельга было араць і былі так расстаўлены, што калгасы якія прыступілі да сяўбы, трактараў не атрымалі, бо трактары знаходзіліся ў раёнах паводкі. У выніку — выдаткаваньне вялікай колькасьці гаручага, многа паломак, якіх можна было ўнікнуць пры правільным скарыстаньні і расстаноўцы трактараў.

Як дырэкцыя, так і раённыя арганізацыі нічога не зрабілі, каб узьняць працоўную дысцыпліну сярод трактарыстаў, каб склаць грамадзкую думку вакол ілже-ударнікаў, закляймініць іх ганьбай і каб усяляк падтрымаць лепшых ударнікаў, прымусіць адстаючых вулыцца на вопыце перадавікоў, як змагацца за высокія тэмпы работы.

Ёсьць многа нараканьняў калгасьнікаў на недапушчальна кепскую апрацоўку глебы.

Неабходна зараз-жа пакласьці канец агідначасьцям, якія наглядаюцца ў Слуцкай МТС.

Трактары працуюць толькі 7 гадзін

ПОЛАЦАК. (Наш кар.).

У Полацкім раёне яшчэ да гэтага часу не надалі адпаведнага палітычнага значэньня «Дню трактара».

Сродкі для рэалізацыі акцый Трактарацэнтру паступаюць зусім неадвальняюча. Калгасы на сёнешні дзень купілі трактарных абавязацельстваў толькі на 7.780 руб. Усяго рэалізавана абавязацельстваў на 16.000 руб., тады як трэба было ўжо даўно рэалізаваць на 33.500 руб.

Трактары, якія ёсьць у раёне, не пераведзены ў напежную спраўнасьць, у сярэднім працуюць у дзень 6-7 гадзін. Трактары, якія ёсьць у саўгасе «Палата», дзякуючы доннаму рамонту не выпрацоўваюць патрэбнай нормы.

Неабходна тэрмінова ліквідаваць абязьлічку ў карыстаньні трактарамі. Трэба вывіць і прыцягнуць да адказнасьці тых, па чыёй віне зрываецца работа МТС.

Анатоль Шустры.

Лён у загоне

ШКЛОЎ, (Наш кар.).

Веснавая сяўба на раёне праходзіць ганебнымі тэмпамі. Шклоўскі раён да гэтага часу ня ўключыўся ў конкурс на лепшае правядзеньне сяўбы.

Раённыя работнікі на запытаньне, што зроблена для рэалізацыі пастановы ЦК КП(б)Б аб конкурсе, адказваюць, што «няма калі гэтай справай займацца».

Работнікі, накіраваныя ў сельсветы, амаль нічога ня робяць для ўзмацненьня тэмпаў сяўбы. У выніку на 20 мая плян сяўбы на раёне выкананы менш чым на 20 проц. Асабліва дрэнна праходзіць сяўбе тэхнічных культур. Плян на ільна 20 мая выкананы на 2,1 проц., карані плодах — на 1,2 проц.

МТС з пляну ў 6.000 гэкт. засеяла толькі 1.205 гэкт. МТС яшчэ не наладзіла сваёй работы. Ёсьць выпадкі прастояў і псаваньня трактараў.

Райземаддзел і райкалгассаюз марудзяць з афармленьнем новых калгасаў.

Апартуністычная бязьдзейнасьць асобных арганізацый ставіць пад пагрозу сваячасовае выкананьне пляну сяўбы.

Чн.

Калгас „Культура“ яшчэ не распачаў сяўбы

СМАЛЯВІЧЫ. Калгас «Культура» да гэтага часу яшчэ фактычна не распачаў сяўбы. Калгасьнікі заняліся ў першую чаргу пасевам сваіх агародаў. Калгас на зьдзельшчыну не пераведзен. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва адсутнічаюць.

Старшыня калгасу Ляховіч падрывае аўтарытэт калгасу — ўвесь час п'янствуе. 17-га мая Ляховіч у п'яным выглядзе пачаў бойку з калгасьнікамі. Ляховіч — былы эканом памешчыцкага маёнтку, нядаўна растраціў грамадзкія гроші.

Кіраўніцтва калгасу павінна быць безадкладна абноўлена.

К-І.

Перамогі паравозных камсамольскіх брыгад

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Паравоз сарыі ІІІ—432 пры прымацаваньні да двух камсамольскіх брыгад (2 сакавіка г.г.) быў тодны толькі на манэўравую работу. Ён меў рад дэфэктаў: працякалі дымагарныя трубы, люкі, цылінравыя крышкі і інш.

Упартай работай камсамольскіх брыгад паравоз зараз прыведзен у належны парадак, усе дэфэкты зьніклі за 52 дні работы паравоз ня даў ніводнае хвіліны спазьненьня ў руху. У адзнаку юбілею «Чырвонай Зьмены» паравоз атрымаў яе назву. Машыністы паравозу—камсамольцы Мартынэнка і Назарынаў. Брыгады ўзялі на сябе абавязкі: ня ставіць паравоз у дэпо ад прамыўкі да прамыўкі, дабіцца найбольшага прабегу, 15-процантнай эканоміі апалу і змазачных матар'ялаў, выконваць сваімі сіламі дробны рамонт і трымаць у поўнай чыстаце паравозныя інструманты. Брыгады выклікалі на спаборніцтва ўсе паравозы сярыі «Ш» Віцебскага вузла на паказаных вышэй пунктах.

Нядбайнасьць, прастоі, растрата гаручага

НА РАСОНСКАЙ МТС

У ажыцьцяўленьні задачы па пасеве ільну і канапель асабліва вялікая адказнасьць ускладаецца на МТС. Яна павінна даць такія тэмпы работы, каб поўнасьцю забясьпечыць выкананьне тых задач, якія на яе ўскладзены. Між тым гэтых баявых тэмпаў няма ў рабоце Расонскай МТС.

У мінулую зіму Трактарацэнтр паведаміў раён, што ў Расоны дасьцца 56 трактараў і адпаведная колькасьць пэрсаналу. Прыбыў дырэктар, агранам, мэханік і, выходзячы з колькасьці энергіі 56 трактараў, заключылі ўмовы з калгасамі на ўсе сельска гаспадарчыя работы. Потым ні з таго ні з сяго Трактарцэнтр урэзае колькасьць трактараў да 26. Прыйшлося ад пляновых калгасных работ адмовіцца. Тым больш, што было завезена ня 26 трактараў, а толькі 14 і... нарэшце, яшчэ 6. Такім чынам, ёсьць 20 трактараў.

Гэта адно. Другое, з падрыхтоўкай кадраў. На 56 трактараў, выходзячы з 3-зьменнай работы, трэба было падрыхтаваць каля 175 чалавек. Набралася 140 чал. з мясцовых калгасаў. Як-жа падрыхтаваны трактарысты? Трэба сказаць проста, што падрыхтаваны вельмі спаба. Яны ў асноўным вывучылі машыну, аднак, ня могуць ведаць ке глыбока і на выпадак, калі ў рабоце трактара здараюцца затрыманьні, дык яны ня прыходзіцца.

Трактары пачалі работу толькі з 7-8 мая, калі ў радзе ільнаводных раёнаў ужо быў пачалову засеян лён.

У першы-ж дзень работы 4 трактары былі загнаны ў балота, дзе знаходзіліся калі двух дзён. Адзін трактар адразу-ж паламаўся і два сапсаваліся. Як правіла, трактар гадзіну працуе, а дзьве стаіць. Каля яго стаяць ладзі і фурманкі, прызначаныя для падвозу гаручага і вады. Нарэшце, выяўляецца, што няма гаручага і трэба ехаць у Полацак. Часьцей за ўсё не хапае змазачнага і бэнзіны на запальваньне.

А. О.

Сёньня ў Макееўцы пачынаецца

ДРУГІ ТЫРАЖ ПАЗЫКІ „ПЯЦІГОДКА—ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ“

АРГАНІЗАЦЫЯЙ ТЫРАЖУ САВЕЦКАЯ ДЗЯРЖАВА ВЫКОНВАЕ СВОЙ АБАВЯЗАК ПЕРАД МІЛЬЁНАМІ ПАЗЫКАТРЫМАЛЬНІКАЎ

Шырока скарыстаць тыраж для сканчэньня рэалізацыі пазыкі

2-гі тыраж—масавы агляд работы па дзяржкрэдыце

Дзяржаўны крэдыт на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва дасягнуў вельмі вялікага разьвіцьця і стаў надзвычай сур'ёзным фактарам фінансаваньня народнай гаспадаркі.

Аднак, посьпехі ў галіне дзяржкрэдыту і ашчаднай справы—асноўнай зброі мабілізацыі распыленых па краіне вольных сродкаў і зьберажэньняў,—далёка яшчэ адстаюць ад эканамічных магчымасьцяй краіны, якія бязупынна ўзрастаюць, у сувязі з няўхільным ростам дабрабыту працоўных мас гораду і вёскі, ліквідацыяй беспрацоўя і вялікім павялічэньнем ліку рабочых, занятых у прамысловасьці, сельскай гаспадарцы, транспарце і інш.

Задачы ўкараненьня дзяржкрэдыту патрабуюць невыпадковай увагі грамадзкасьці і актыўнага ўдзелу апошняй у папулярызацыі і пашырэньні дзяржкрэдыту. Асабліва значэньне мае даны адрэзак часу, паколькі мы фактычна набліжаемся да завяршэньня кампаніі рэалізацыі першага выпуску пазыкі «Пяцігодка».

Пры ўсёй грандыёзнасьці дасягнутых посьпехаў, рэалізацыя пазыкі «Пяцігодка» не дала аднак поўнага выкананьня кантрольных лічбаў.

Усяго па БССР рэалізавана аблігацый пазыкі на суму 19.912 тыс. руб., што складае 93 проц. заданьня.

Трэба адзначыць, што пры пасьпяховай рэалізацыі пазыкі сярод рабочых і служачых, СТАНОВІШЧА Ў СЕЛЬСКІМ СЭКТАРЫ ЯК І РАНЕЙ, НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЕ. Заданьне па групе вясковага насельніцтва выканана ўсяго ў разьмеры 54,9 проц.; параўнальна нездавальняючыя вынікі і па групе неарганізаванага насельніцтва (85,8 проц. заданьня).

ВЫКАНАНЬНЕ КАСАВАГА ПЛЯНУ (паступленьне грошай па пазыцы) ідзе чарапашымі тэмпамі: у першым квартале паступленьне грошай складала ўсяго 59,7 проц. квартальнага пляну, прычым у горадзе касавы плян выканан у разьмеры 75,9 проц., а на вёсцы ўсяго на 28 проц.

Касавы плян на красавік у суме 3.900 тыс. руб. выканан на 42,2 проц.— паступіла 1.658 тыс. руб., прычым сярод гарадзкога насельніцтва заданьне ажыцьцяўлена на 56,3 проц., а сярод сялянства на 20,4 проц.

Трэба адзначыць, зьніжэньне тэмпаў паступленьня ў другім квартале параўнальна з мінулым.

Гэтыя паказальнікі гавораць аб тым, што перад намі стаяць вялікія задачы па забесьпячэньні поўнага выкананьня і перавыкананьня заданьня, бо найменшае недавыкананьне кантрольных лічбаў б'е па фінансаваньні народна-гаспадарчага пляну трацягa году.

ДРУГІ ТЫРАЖ ПАЗЫКІ, ЯКІ СЁНЬНЯ АДБЫВАЕЦЦА Ў МАКЕЕВУЦЫ, ПАВІНЕН БЫЦЬ СКАРЫСТАНЫ ДЛЯ ЗАМАЦАВАНЬНЯ ЎСЁЙ ПРАВЕДЗЕНАЙ РАБОТЫ, ПАВІНЕН ЗЬЯВІЦЦА БАЗАЙ ДЛЯ ПАСЬПЯХОВАГА ЗАВЯРШЭНЬНЯ КАМПАНІІ. ТРЭБА ПЕРАТВАРЫЦЬ ДРУГІ ТЫРАЖ У МАСАВЫ АГЛЯД РАБОТЫ ПА ДЗЯРЖКРЭДЫЦЕ.

Дні тыражу трэба скарыстаць для самаправеркі ахопу працоўных падпіскай на кожнай фабрыцы, заводзе, саматужнай арцелі, калгасе, саўгасе, установе. У выніку самаправеркі трэба забясьпечыць сапраўднае стопроцантнае ўцягненьне ў падпіску арганізаваных працоўных.

Адначасова трэба праверыць своячасовасьць паступленьня і здачы чарговых узносаў па пазыцы, прыняць самыя рашучыя меры для поўнай ліквідацыі запазычанасьці.

Камісіі садзейнасьці і ашчадкасы павінны забясьпечыць выразнае абслугоўваньне пазыкатрымальнікаў у адносінах замацаваньня аблігацый, сканчэньня абмену аблігацый ранейшых пазык і праверкі выйгрышаў.

Наяўнасьць у краіне неатрыманых выйгрышаў НА СУМУ 60 МЛН. РУБ. сьведчыць аб слабай рабоце фінансава-крэдытных органаў і грамадзкіх арганізацый, аб тым, што насельніцтва не азнаёмлена з тыражамі пазык.

Тыраж павінен рашуча актывізаваць работу камісій садзейнасьці ва многіх раёнах і гарадох. Асабліва важныя задачы стаяць на вёсцы, дзе тыраж павінен быць увязан з замацаваньнем усёй вясковай падпіскі, з ажыўленьнем работы нізавых вясковых камісій садзейнасьці, якія ў большасьці сельсаветаў існуюць толькі на паперы (Сымілавічы, Глуск, Барысаў, Крупкі, Багушэўск).

Пры шырокім удзеле савецкай грамадзкасьці мы даб'ёмся пасьпяховага сканчэньня кампаніі рэалізацыі першага выпуску пазыкі «Пяцігодка» і поўнага выкананьня, вызначаных партыяй і ўрадам кантрольных лічбаў.

БЛІСКУЧЫ ПАЧЫН РАБОЧЫХ ЗАВОДУ „ПРАЛЕТАРЫ“

ГОМЕЛЬ (Наш кар.). Рабочыя Гомельскага заводу «Пралетары» зьвярнуліся праз «Палескую праўду» з адкрытым лістом да ўсіх рабочых і калгаснікаў Гомельскага раёну. У сваім лісьце яны пішуць:

«Вялізарная гістарычная задача пабудовы фундаменту сацыялістычнай эканомікі, будаўніцтва «518» і «1040» патрабуе ўзмоцненага ўцягненьня сродкаў працоўнага насельніцтва ў справу фінансаваньня сацыялістычнай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі.

Дагэтуль плян мабілізацыі сродкаў выкананы толькі на 62 проц.

Улічваючы такое становішча, мы бярэм на сябе наступныя абавязацельствы:

— **Выканаць сустрэчны плян укладаў у ашчадкасы замест 15.000 руб. 20.000 руб.**

— **Ахапіць падпіскай на пазыку 100 проц. рабочых і служачых.**

— **Давесьці фінплян да кожнай брыгады, да кожнага рабочага.**

— **Выкарыстаць лепшага ўдарніка для работы ў фінсэкторы.**

— Поўнасьцю ажыцьцявіць безнаўдны разьлік праз ашчадкасу.

Рабочыя «Пралетарыя» выкажуць лепшых ударнікаў для дапамогі прадпрыемствам, якія адстаюць у галіне мабілізацыі сродкаў.

Вынікі зусім не здавальняючыя

ЧАВУСЫ. (Наш кар.). Плян мабілізацыі сродкаў за дзьве дэкады мая выкананы зусім нездавальняюча. Заданьне па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады», якое займае 23,1 проц. квартальнага пляну, выканана на 3,1 проц.

Антопаўскі, Благавіцкі, Макрацкі, Галавенчыцкі, Прылескі сельсаветы рэалізавалі ад 1,8 проц. да 6,6 проц. квартальнага заданьня, іншыя сельсаветы не рэалізавалі ні аднаго рубля. Чавускі гарсавет, які аддаў гэтай справе належную ўвагу, выканаў 29 проц. квартальнага заданьня па рэалізацыі пазыкі.

Усебеларуская крэдытная нарада

23 мая адкрылася ўсебеларуская нарада работнікаў дзяржкрэдыту і ашчадкас.

З дакладам аб выніках кампаніі па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады» выступіў намесьнік наркамфіна БССР тав. **Абрамсон.** Па дакладу тав. Абрамсона разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі.

Учора ў спрэчках па дакладу т. Абрамсона выступіў наркамфін БССР тав. **Хацкевіч.**

— «Пляны індустрыялізацыі і калектывізацыі с.-г., культурнага будаўніцтва БССР, якія вызначаны на трэці рашаючы год пяцігодкі, зусім адпавядаюць нашым фінансавым магчымасьцям.

Таму ўсякія разважаньні аб немагчымасьці выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў, усякае ныцьцё трэба разглядаць, як яскравыя праваапартыністычныя настроі, як няўменьне працаваць бальшавіцкімі тэмпамі.

Мы знаходзімся ў акружэньні ворагаў, капіталісты нам крэдытаў не дадуць; мы павінны самі мабілізаваць усе сродкі і рэсурсы, каб ажыцьцявіць грандыёзныя пляны, вызначаныя партыяй і ўрадам.

Каб выканаць фінплян, трэба ўмець арганізоўваць яго выкананьне; тут на вас прыпадаюць асабліва адказныя і вялікія задачы.

Больш сувязі з масамі! Больш работы па ўцягненьні грамадзкасьці ў мабілізацыю сродкаў! Толькі перабудаваўшы сваю работу на падставе масавасьці, фінансава-крэдытны апарат справіцца са сваімі задачамі».

Тыраж у Макееўцы

Сёньня ў горадзе Макееўка (Данбас) пачынаецца другі тыраж выйгрышаў пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады».

У гэтым тыражы па прокантна-выйгрышных і бяспроцантна-выйгрышных выпусках пазыкі будзе разыграна 244,470 выйгрышаў на суму звыш 50 млн. руб.

На тыраж выехалі старшыня цэнтральнай камісіі садзейнасьці дзяржкрэдыту СССР тав. ЧУЦКАЕЎ, нам. Наркамфіну СССР тав. ГЁНКІН, член калегіі НКФ СССР тав. МАМУНІА і інш.

З розных канцоў СССР на тыраж зьехаліся лепшыя ўдарнікі заводаў і фабрык і перадавыя калгаснікі, выбраныя агульнымі сходамі.

У Макееўцы зараз ідзе вельмі ўзмоцненая работа па падрыхтоўцы да тыражу, па замацаваньні дасягненьняў у рэалізацыі пазыкі.

ВЫПУСЬЦІЦЬ ПАЗЫКУ „ІМЯ 3-га РАШАЮЧАГА“ патрабуюць працоўныя БССР

ЗЬЛЁТ УДАРНІКАЎ **ВІЦЕБСКАГА ЛЕСПРАМГАСУ** ЗЬВЯРНУЎСЯ ДА ЎРАДУ СССР З ПРОСЬБОЙ ВЫПУСЬЦІЦЬ НОВУЮ ПАЗЫКУ «ІМЯ ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ». ПАЗЫКА ПАВІННА ДАЦЬ НОВЫЯ МІЛЬЁНЫ НА СПРАВУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА, НА СПРАВУ ПАБУДОВЫ «518» І «1040».

* * *

КАЛЕКТЫЎ РАБОТНІКАЎ **БЕЛМЭТАЛЯАБ'ЯДНАНЬНЯ** ПАСТАНАВІЎ ПРАСЦЬ ЎРАД ВЫПУСЬЦІЦЬ ПАЗЫКУ «ІМЯ ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДУ», ЯКАЯ ПАВІННА ДАЦЬ ДАДАТКОВЫЯ СРОДКІ НА ПАБУДОВУ ФУНДАМАНТУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЭКАНОМІКІ СССР.

У ЯКАСЬЦІ АДКАЗУ НА ПРАВАКАЦЫЙНЫЯ ВЫПАДЫ ІМПЭРЫЯЛІСТАЎ, НА ШАЛЁНУЮ НАДРЫХТОЎКУ ВАЙНЫ СУПРОЦЬ СССР, СУПРАЦОЎНІКІ ПАДПІСАЛІСЯ НА НОВУЮ ПАЗЫКУ НА СУМУ 4.500 РУБ., ШТО СКЛАДАЕ 111 ПРОЦ. ІХ ЗАРПЛАТЫ.

* * *

НАРАДА РАБОТНІКАЎ **ЮРАВІЦКАГА РАЙФІНАДДЗЕЛУ** ЗЬВЯРНУЛАСЯ ДА САВЕЦКАЙ ЎЛАДЫ З ПРОСЬБАЙ ВЫПУСЬЦІЦЬ ПАЗЫКУ ПАД НАЗВАЙ «ТРЭЦІ РАШАЮЧЫ ГОД ПЯЦІГОДКІ». ПА ЎСТАНОВЕ ЎЖО ПРАВЕДЗЕНА ДАТЭРМІНОВАЯ ПАДПІСКА НА НОВУЮ ПАЗЫКУ, ЯКАЯ ДАЛА 120 ПРОЦАНТАЎ МЕСЯЧНАГА АКЛАДУ. НА САЦСПАБОРНІЦТВА ПА ДАТЭРМІНОВАЙ ПАДПІСЦЫ ВЫКЛІКАНЫ ЎСЁ МЯСЦКОМЫ. ДЗЯРЖУСТАНОЎ ЮРАВІЦКАГА РАЁНУ.

* * *

АШЧАДКАСА № 23 ПРЫ **НОВА-БАРЫСАЎСКІМ ПАШТОВЫМ АДДЗЯЛЕНЬНІ** АТРЫМАЛА ЗАДАНЬНЕ ДАДАТКОВА РЭАЛІЗАВАЦЬ ПАЗЫКУ «ПЯЦІГОДКА — ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ» НА 8000 РУБ. РЭАЛІЗАВАНА АБЛІГАЦЫЙ НА 11.255 РУБ.

7 млн. руб. не дапаступіла ў дзяржкасы

Кантрольная лічба па рэалізацыі пазыкі сярод рабочых і служачых значна перавыкананa. Замест 13.700 тыс. руб. рэалізавана 15.333 тыс. Паступіла-ж у дзяржаўныя касы толькі 9.283 тыс. руб.

На вёсцы трэба было рэалізаваць аблігацый на 6 мільёнаў руб., рэалізавана на 3.292 тыс.; паступіла грошай толькі 2.530 тыс.

Сярод іншых груп насельніцтва распаўсюджана аблігацый на 1.287 тыс. руб. пры заданьні ў 1.500 тыс., паступіла грошай 830.000 руб.

Усяго пры суме рэалізацыі ў **19.912 тыс., паступіла 12.643 тыс.**

Гэтыя лічбы гавораць аб зусім слабой рэалізацыі пазыкі на вёсцы і аб недапушчальнай разьбежцы паміж рэалізаванай сумай і паступіўшымі ўзносамі.

Такое становішча тлумачыцца слабым кантролем і кіраўніцтвам з боку ашчадкас, слабой актыўнасьцю нізавых зьвеньняў ашчаднага апарату і адсутнасьцю неабходнай мабілізацыі ўвагі грамадзкасьці вакол гэтага пытаньня.

Тыраж пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады», які сёньня адбываецца ў Макееўцы, павінен быць скарыстаны для ліквідацыі запазычанасьці па ўзносах.

Сотні рабочых не ахоплены падпіскай

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Камісіі садзейнасьці і фабкомы раду прадпрыемстваў гораду прымаюць вельмі слабы ўдзел у мабілізацыі сродкаў, у прыватнасьці, у рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка». На фабрыцы «Вэзуві» 15-га мая павінен быў адбыцца мітынг па пытаньні ліквідацыі прарываў у выкананьні фінпляну. Фабком не забясьпечыў яўкі рабочых на мітынг, не папулярызаваў гэтага мерапрыемства. У выніку замест 1.500 рабочых, прышло толькі 30. Падпіска на пазыку на заводзе складае 53.000 руб., пры месячным заработку ў 130.000 руб. За красавік па фабрычнай ашчадкасе меў месца адліў укладаў у суме 9.000 р.

На фабрыцы «Кастрычнік» 40 новых рабочых не ахоплены падпіскай на пазыку.

Зусім бязьдзейнічалі дагэтуль камісіі садзейнасьці заводу «Рухавік рэвалюцыі», элеватару фабрыкі імя Клары Цэткін. Зараз некалькі камісій садзейнасьці за бязьдзейнасьць распушчаны і перавыбраны. Ш.

Новы набор у інстытут Чырвонай прафэсуры і задачы Беларускай партарганізацыі

На даным этапе, калі СССР уступіў у нарыд сацыялізму, а на капіталістычны сьвет насоўваецца новая хваля пралетарскай рэвалюцыі — перад нашай партыяй паўсталі грандыёзныя задачы ў галіне падрыхтоўкі кадраў наогул, у галіне падрыхтоўкі тэарытычных кадраў, у прыватнасьці.

Калі да апошняга году ў Інстытуце чырвонай прафэсуры праходзілі марксыцка-ленінскую вучобу сотні партыйцаў, дык зараз колькасьць слухачоў ІЧП, якія сталі на падставе пастановы ЦК УсеКП(б) сустаўной часткай Камакадэміі, будзе налічвацца тысячамі. Калі дагэтуль Інстытуты чырвонай прафэсуры выпускалі толькі адны ідэалёгічныя кадры ў вузкім сэнсе гэтага слова (навуковых работнікаў, настаўнікаў), дык зараз ЦК УсеКП(б) ускладвае на ІЧП абавязкі рыхтаваць тысячы высокакваліфікаваных партыйцаў як для навукова-дасьледчай і плянавай работы ў розных галінах сацыялістычнага будаўніцтва, так і для навукова-пэдагагічнай і партыйнай работы.

Цэнтр марксыцка-ленінскай тэарытычнай мысьлі — Камакадэмія, якая ўключыла ў сваю навуковую лябараторыю Інстытуты чырвонай прафэсуры, становіцца сапраўдным правадыром і сапраўднай ударнай брыгадай тэарытычнага фронту.

Усе гэтыя зусім выключныя па сваім размаху задачы ІЧП змогуць вырашыць толькі пры актыўным удзеле ўсёй партыі і партарганізацый усіх братніх рэспублік СССР. Зразумела, той станоўчы факт, што за апошнія месяцы ўдалася сканцэнтраваць моцнае ядро асьпірантуры пры Беларускай Акадэміі навук — зьяўляецца вялікім дасягненьнем КП(б)Б, але было-б блізарукасьцю, калі-б побач з падрыхтоўкай тэарытычных кадраў у межах сваёй рэспублікі, нашы рэспубліканскія партарганізацыі адмовіліся пасылаць у Маскву пэўную частку партыйна-вытрыманых таварышоў для прахаджэньня марксыцка-ленінскай вучобы ў нетрах вялікай лябараторыі тэарытычнай мысьлі—Камакадэміі. Вось чаму мы мяркуем, што партыйныя арганізацыі буйнейшых прадпрыемстваў, ВНУ, Камвуз БССР павінны вылучыць дзесяткі лепшых партыйцаў, перадавых рабочых у лік слухачоў, як асноўных Інстытутаў чырвонай прафэсуры, так і Інстытуту марксыцка-ленінскай вучобы (падрыхтоўчага аддзяленьня ІЧП). Гэтыя таварышы стараюць у Маскве сваясаслівых «фарпост» партыйнага тэарытычнага маладняка Беларусі і, праходзячы бальшавіцкую школу перадавой партыйнай арганізацыі сталіцы сусьветнай рэвалюцыі і выключна інтэнсыўнага партыйнага жыцьця ўнутры парткалектыву ІЧП — стануць у далейшым у першыя рады тэарытычнага фронту Беларусі.

Актыўны ўдзел беларускай партарганізацыі ў падрыхтоўцы тэарытычных кадраў патрэбен ня толькі таму, што нашы кадры колькасна да гэтага часу яўна невыстарчальны, але і таму, што ўдзельная вага Беларусі ў рабоце Камакадэміі да апошняга часу яшчэ вельмі нязначная.

Паўтараем — толькі шляхам адначасовай падрыхтоўкі навуковай зьмены: «у сябе дома», у БССР, і ў ІЧП Камакадэміі — мы вырашым пастаўленую партыяй задачу, задачу падрыхтоўкі бальшавіцкімі тэмпамі ў бліжэйшыя гады тысяч новых змагароў на тэарытычным фронце.

Брыгада Камакадэміі па вярбоўцы ў ІЧП:
КАРМІН, КРАСЬНЕЎСКІ, РЫОЛЬФ, ПІФРЫНОВІЧ.

УСІМ ПАДПІСЧЫКАМ „ЗЬВЯЗДЫ“.

Каб увікнуць пераболў у атрыманьні газэты, просьба здаваць падпіску (як калектыўную, так і індывідуальную) НЕ ПАЗЬНЕЙ 26-га кожнага месяца.

26 мая—апошні дзень здачы падпіскі на чэрвень.

Падпіска, якая паступіць пасьля 26 мая, будзе перанесена на ліпень.

У ПРЭЗЫДЫУМЕ ЦВК БССР

Зацьверджаньне камісій пры Цэнтральным Выканаўчым Камітэце

Прэзыдыум ЦВК БССР зацьверджаў нацыянальную камісію ЦВК у наступным складзе: т. т. **Гнілякевіч** (старшыня камісіі), **Вансоўскі** (нам. старшыні), **Чарнушэвіч, Рыжоў, Платун, Гурэвіч, Бучукас, Хацкевіч, Васілевіч, Палякоў, Равіс, Валодзька, Майзіт, Горын, Дунец, Фэрбэр, Супрановіч, Гальмшток** (адказны сакратар).

* * *

Камісія прыватных амністый пры прэзыдыуме ЦВК зацьверджана ў наступным складзе: т. т. **Іваноў** (старшыня). **Марусевіч** (нам. старшыні), **Русецкі** (адказны сакратар), **Шапіра, Жолудаў, Файнбург, Дубаўцоў і Жуковіч.**

* * *

З прычыны выбыцьця некаторых членаў цэнтральнай выбарчай камісіі, прэзыдыум ЦВК зацьверджаў апошнюю ў выдыум ЦВК зацьверджаў апошнюю ў наступным складзе: т. т. **Гнілякевіч** (старшыня), **Вансоўскі, Валодзька, Марусевіч, Праліч, Гантман, Гаруновіч, Кісельгоф, Мікуліч А. П., Адзінцоў** (адказны сакратар), **Плешакоў, Гуткін, Дунец, Бучукас, Цімашэнка, Манжалей, Плятнёў, Нахамава, Равіс, Грушнікаў** (камуна «Бальшавік»), **Каранеўскі** (калгас «Чырвоны партызан») і **Гутман.**

З прычыны сканчэньня і падагульваньня вынікаў выбарчай кампаніі, прэзыдыум ЦВК пастанавіў **распусьціць раённыя, гарадзкія і сельскія выбарчыя камісіі апрача менскай, гомельскай і віцебскай,** якія часова пакінуць.

* * *

Цэнтральная камісія садзейнасьці дзярж крэдыту і ашчадсправе зацьверджана ў наступным складзе: т.т. **Вансоўскі** (старшыня), **Бунін** (Наркамфін), **Захарава** (галоўкіраўніцтва ашчадкасамі), **Плешакоў** (ЦСПСБ), **Каган (ЦК КП(б)Б), Каранеўскі** (Менгарсавет), **Наўроцкі** (Менскі гарнізон), **Дваржэцкі** (ВСНГБ), **Дубіцкая** (завод «Бальшавік»), **Шастакоў** (рэдактар газ. «Савецкая Беларусь»), **Асмалоўскі** (Белкалгасцэнтр), **Навальскі** (завод «Камунар»), **Ваўчок** (завод імя Варашылава), **Філатаў** (Дзяржбанк), **Вольпава** (НКФ), **Шабуновіч** (Эльвод), **Навіцкі** (друкарня імя Сталіна), **Міруц** (ЦП саюзу лесдрэварабочых) і **Кайкоў** (саюз банкаўскіх служачых).

* * *

Камітэт па паляпшэньні працы і быту работніц і сялянак пры прэзыдыуме ЦВК БССР зацьверджан у складзе т. т.: **Гнілякевіч** (старшыня), **Майзіт** (нам. старшыні), **Юшкевіч, Махліна, Зянькевіч, Гурэвіч** (НК Аховы здароўя), **Лібінзон** (ЦК КП(б)Б), **Гусіна** (ЦК КСУ), **Праліч** (работніца, член прэзыдыуму ЦВК), **Дубіцкая** (завод «Бальшавік»), **Ганчарова** (завод імя Варашылава), **Давідовіч** (ЦСПСБ), **Кірнос** (Белкалгасцэнтр), **Гольдвасэр** (Белжылсаюз), **Казлоўскі** (ЦВК БССР), **Гальмштон** (нацкамісія ЦВК), **Адамчук** (аргаддзел ЦВК), **Амбражунас** (ВСНГ), **Міхайлаў, Бурава** (НК РСІ), **Каранеўскі** (гарсавет), **Манжалей** (ЦП саюзу рабземлес), **Гуцянкова** (Белкаапсаюз), **Аляніцкая** (ЦВК), **Пушчын** (НК Працы), **Даўгапанцава** (НКЗ) **Сланімская** (НКАсьветы), **Клыс** (Дзяржплян) і прадстаўнік ад Белпрамсаюзу.

Усім Гаркомам і РК КП(б)Б

1) На грунце пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б вызначаюцца на 1931 г. наступныя нормы прыёму ў Камвуз Беларусі імя Леніна.

1.	Аддзяленьне Партбудаўніцтва	— 200
2.	» » Сав. будаўніцтва	— 60
3.	» » Прапагандысцкае	— 90
4.	» » Нацмен:	
	а) Яўрэйскае	— 35
	б) Польскае	— 25 60
5.	» » Раб. друку	— 100

Усяго на асноўны сэктар 510 ч.

2. Для забесьпячэньня ўкамплектаваньня ўсіх аддзяленьняў і курсаў, ГК і РК павінны праз адборачныя камісіі правесьці адбор т. т., якія адпавядаюць умовам прыёму ў Камвуз і забясьпечыць, як водпуск для падрыхтоўкі, а таксама своячасовую яўку іх для прахаджэньня ўступных іспытаў і на вучобу.

3. Устанавіць наступнае размеркаваньне месц для асобных арганізацый (уключаючы ўжо вылучаных ў Камвуз тав.) з дадаткам 50 проц. для адбору:

1.	Менскі ГК	— 55
2.	Віцебскі »	— 40
3.	Гомельскі »	— 40
4.	Магілеўскі »	— 30
5.	Аршанскі »	— 25
6.	Бабруйскі »	— 30
7.	Барысаўскі »	— 30
8.	Полацкі »	— 20
9.	Мазырскі »	— 10
10.	Шклоўскі »	— 15
11.	Лепельскі »	— 10
12.	Жлобінскі »	— 15
13.	Горацкі »	— 10
14.	БВА »	— 25
15.	Усім астатнім райкомам па 5 чалавек	— 425 чал.
		780

4. Усім партарганізацыям незбходна пры адборы кандыдатур максымальна ўважліва адносіцца да таго, каб вылучаліся найбольш партыйна-вытрыманыя таварышы з тым, каб у складзе залічаных студэнтамі было ня менш 70 проц. рабочых; 20 проц. жанчын, зьвярнуць увагу на вылучэньне калгаснікаў.

5. Выклік на кароткатэрміновыя курсы падрыхтоўкі асобных груп паступаючых і на прыймовыя іспыты будзе праведзен асобна праз друк.

Сакратар ЦК — ГЕЙ.
Культпроп — ЧАРНУШЭВІЧ.
Рэктар КУБ — САЕВІЧ.

УДАРНАЯ ПЕРАКЛІЧКА

Недалёка ад раённага цэнтру **Касьцюковічы** знаходзіцца вёска **Дубраўка.** Старэнькія хаткі з маленькімі вакенцамі гавораць аб тым, што раней жылося тут ня вельмі солодка. Варта толькі ўзыйсьці на ўзгорак, дзе жыве бадзяк **Андрэйчык,** паглядзець направа—налеві, як на высьпе. Яны цягнуцца на цэлыя кілёмэтры, а там далей — балоты. Гэтыя балоты карысьці ніякай не давалі. На іх, акрамя іўху ды маленькай каравай сасонкі, нічога не расло.

Самыя лепшыя землі знаходзіліся ў руках памешчыка, кулака ды попа. У Дубраўцы жыла голь перакатная. Большая частка вёскі за палову зімы зьядала ўсе запасы, сабраныя са сваіх палосак ураджаю. Потым ішлі да пана і прасілі работы. Зварачаліся за дапамогаю да кулака. Апошнія абіралі дубраўскіх сялян дагала.

Калі сялянскія хлопцы ўпэўніваліся, што ў сябе на бацькаўшчыне выхаду знайсьці ня можна, тады яны ішлі ў горад і там шукалі работы.

Першым з вёскі паехаў яшчэ ў 1912 годзе ў капальні самы смелы і здаровы хлапец **Шафранскі.** С пачатку ён быў чорнарабочым. Паўсутки гарняк знаходзіўся пад зямлёй.

Шафраноўскаму давялося папрабаваць усе прыгожасьці жыцьця і работы ва ўласьніка капальні. Па 30 пудоў вугалю на санях вывозіў да карэннага штрэку. У казармах вошы поўзалі па нарах. Там было брудна і цесна. Шафраноўскі напісаў дадому ліст. Пісаў аб труднасьцях у рабоце ў капальнях і, урэшце, — усё-ж лепш жыць, чым дома.

У адказ на капальні паехалі многія з Дубраўкі.

* * *

Пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Дубраўцы пачалося другое жыцьцё. Ужо сваякі пісалі гарнякам:

— Прыяжджайце дадому, падзяляюць зямлёй...

Многія вярнуліся. Але Шафраноўскі ня кінуў работы. Ён застаўся ў Данбасе да сёньняшняга дня.

Шафраноўскі бязьзьменна працуе ў забоі на Шчарбінаўцы ў капальні № 11. Шафраноўскі — кіраўнік ударнай брыгады на ўрубаўцы, дзе кірку замяніла ўрубавая машына.

Шафраноўскі карыстаецца аўтарытэтам у капальні. Ён, як вопытны гарняк, пасылаецца рабочымі на самыя адказныя вучасткі здабычы. Аддаванасьць да работы Шафраноўскага характарызуецца тым, што за ўвесь час у яго ня было ніводнага прагулу.

* * *

Данбасу патрэбны кадры рабочых. Рост сацыялістычнай гаспадаркі краіны патрабуе павялічэньня праграмы здабычы вугалю. Каменнавугальная прамысловасьць яшчэ не ліквідавала сваіх прарываў.

Патрабавалася накіраваць гарнякоў па усёй краіне для вярбоўкі рабочай сілы ў капальні. Рабочыя Шчарбінаўкі спыніліся на кандыдатуры Шафраноўскага:

— Ты павінен ехаць у Беларусь і вярнуць старых вуглякопаў Данбасу,— тут-жа заявіў агульны сход капальні № 11.

— Малапісьменны я, мабыць, ня спраўлюся з гэтай справай, — гаварыў Шафраноўскі.

— Усюды спраўляўся, справішся і там, — пярэчылі рабочыя.

На другі дзень ён паехаў у Беларусь. Прыбыў у сваю вёску Дубраўка. Зьявіўся да старшыні **Негінскага** сельсавету **Шматкова.** Расказаў яму, зачым прыехаў і папрасіў дапамогі.

Шматкоў «запэўніў» Шафраноўскага ў тым, што ў раёне сельсавету няма рабочай сілы.

— А я папрабую знайсьці, — заявіў Шафраноўскі.

— Ну, што-ж, ваша шчасьце, калі знойдзеце, а ўсё-ж такі я думаю, што ня знойдзеце, — адказаў старшыня Шматкоў.

* * *

Увечары хлопчыкі бегалі па Дубраўцы і запрашалі на сход:

— Шмахцёр хоча пагаварыць аб чымсьці, — заявілі яны.

— Прыдзема, — запэўнілі сяляне.

Хата Гарасіма напаўнялася сялянамі. Прыйшлі маладыя хлапцы і дзяўчаты. Пачаўся сход.

— Старшыню і сакратара сходу абярэм, ці мо' не? — спытаўся Шафраноўскі.

— Да чым сам будзь і старшыня і сакратаром, — адказала пекавая сходу.

— Дык вось, браты, — пачаў Шафраноўскі, — я прыехаў пагаварыць пра тым, як мы жывем у Данбасе. Ведаем, як хачу ведаць, як вы жывяце.

— Ну, вядома, свой чалавек, цікавіцца нашым жыцьцём, — перабілі яго сяляне. Шафраноўскі гаварыў далей:

— Партыя і ўрад усклалі на нас адказны абавязак: даць прамысловасьці транспарту апал. Гэта задача датычыць і вас. У ёй зацікаўлена ўся народная гаспадарка, усе працоўныя. Калі, скажам, у нас прарыў, дык і ў вас прарыў.

— Пляну здабычы ўгалю мы ня выконваем. Галоўная прычына — недахват рабочай сілы. Вы, старыя гарняки павінны памагаваць, як трэба дапамагчы ліквідаваць прарывы. Я заклікаю вас вярнуцца ў капальні.

— Аб ільготах, якія вам даюцца, вы даведаецеся ў тых дагаворах, якія з вам раздам.

— Партыя і ўрад клапоцяцца аб нас. Пабудавалі мы ў капальнях дамы: дзе халасьцякоў — інтэрнаты, сямейным — кватэры з двух пакояў. Садоў пачалі каапэрацыйную работу палавіны, тапарты атрымліваем. Хлеб — поўсёлы. Стаўлоўкі працуюць добра. Вядома, шмат чаго яшчэ ня зроблена...

Пасьля прамовы Шафраноўскага выступіў незнаёмы малады хлапец. Яго выступленьне зводзілася да пастаўкі:

— Праца ў капальнях катаржная. Я там быў, ня вытрымаў, уцёк...

— Хоць ты і негінскі, сусед, але скажу табе, што ты падкулачнік.

Дзядзька Шафраноўскі, калі ўбачыў чымсьці ёсьць там работа, запішэце мне, — так дала адпор негінскаму дэзэртыру **Кавалёва Наста.**

— У нас жанчыны працуюць на мэханізмах, — растлумачыў Шафраноўскі.

— Тады і мяне запішэце, — папрасіла сваячка вуглякопа — **Шафраноўская Марыля.**

— І нас пішэце, мы таксама паедзем у капальні. — папрасілі яшчэ тры дзяўчыны.

Гарасім Шафраноўскі падняўся з месца і папрасіў слова:

— Мая Марылька едзе ў Данбас, а я іду ў калгас — мы дакажам розным трусом, як трэба працаваць, — гледзіце, ці твар негінскаму дэзэртыру, заявіў Гарасім. Гарасіма даноўніў **Андрэйчык Антось** — спрадвечны пастух:

— Завядзецца паршывая авечка і ўсё стада псуе. Так і негінскі вось гэты хлапец, паехаў у Данбас, пабіў там пару дзён, а цяпер брэша, што там дрэнна. Ты-ж не даведаўся там нічога як сьлед. Запішы там і мяне, Шафраноўскі.

Час быў позны. За поўнач пераваліла, калі сяляне пакінулі сход. Як разыходзіліся, гаварылі аб тым, што Шафраноўскі і ў маладосьці ня любіў пускаць словы на вецер. Зараз — тым больш. **На другі дзень 50 чал. дубраўскіх сялян і сялянак накіраваліся ў сельсавет за дакумантамі. Сярод іх пяць дзяўчат. 45 былых гарнякоў, працаваўшых яшчэ ў старыя часы ў капальнях.**

Шматкоў, выдаючы дакумэнты, кожнаму напамінаў:

— Глядзеце, ох будзеце каяцца...

— Не маленькія і не з багатых. Ведаем, што робім, — адказвалі гарнякі.

Шафраноўскі накіраваўся ў іншыя сельсаветы **Касьцюковіцкага** раёну вербаваць рабочых для каменнавугальнай прамысловасьці.

* * *

Гэтымі днямі Наста Кавалёва напісала ліст таварышкам, у якім яна паведамляла:

— Працую качагарам. Зарабляю добра. Прымаю ўдзел у грамадзкім жыцьці. Адным словам, працуем па-ўдарнаму...

Марыля Шафраноўская піша бацьку, што яна пакуль працуе на сартыроўцы, скора пяройдзе на іншую работу. Зьяўляецца ўдарніцай. У лісьце пытаецца:

— Напішэце мне, як вашы справы? Як працуе калгас?

Герасім напісаў дачцы адказ:

— Ад цябе, дачка, не адстаў. Я таксама калгаснік і зьяўляюся лепшым ударнікам. Адным словам, тэмпаў не здаем. Веснавая сяўба — у разгары. Плян будзе выканан

Так пераклік